Прылетарыі ўсіх краёў, злучайцеся

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 4 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.
Невыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц — 70 к. „ 3 „ — 2 р. — к. „ 6 „ — 4 р. — к. „ 1 год — 7 р. — к. Змена адрасу: іншагародняя—20 к. мясцовыя —10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок нашпарэлі насьля тэксту — р. 50 к. За радок нашпарэлі наперад тэксту 1 р. — к. За радок нашпарэлі перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьпешныя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумант 35 кап. За кожны дадатковы 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумант 15 „ За кожны дадатковы 5 „ Публікацыі ЗАГС—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах.

АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

8 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 258 (2150) Аўторак, 15-га лістапада 1927 г

Захватніцкая палітыка Польшчы.

Толькі што ўдалося савецкаму ўраду перамагчы выпады ангельскіх імпэрыялістаў і ўзмацніць добрасуседзкія ўзаемаадносіны СССР з адным з яго заходніх суседзяў—Латвіяй, як зноў калі нашых межаў зьбіраюцца чорныя хмары,

Цэлы шэраг фактаў сьведчыць аб тым, што польскі ўрад настаўлены «актывізаваць» сваю палітыку на ўсход і ў першую чаргу супроць Літвы.

Уздоўж літоўскай мяжы канцэнтруецца польскае войска; праводзіцца цэлы шэраг ваенных падрыхтовак; зноў на сцэну зьявіўся відомы «заваёўца Вільні» генэрал Жэлігоўскі і зрабіліся больш частымі паездкі ў Вільню самога Пілсудзкага і г. д.

Разам з тым, апроч гэтай ваеннай падрыхтоўкі, захопу Літвы, праводзіцца і палітычная падрыхтоўка «ўзлучэньня Літвы з Польшчаю», шляхам адпаведнай апрацоўкі грамадзкай думкі.

Арганізаваны ў Рызе агентамі польскай дэфензывы зьезд літоўскіх эмігрантаў паказаў, якія мэтады ўжывае польскі ўрад для інсцэнірэўкі гарачага жаданьня Літвы «ўзлучыцца» з Польшчаю. Польскія фашысты ня маюць вічога супроць таго, каб спэкульнуць на рэакцыйнасьці сучаснага літоўскага ўраду і, падрыхтоўваючы супроць яго пераварот у Літве, хочуць надаць гэтаму характар абурэньня літоўскіх мас, выкарыстоўваючы для гэтага прадаўшых сябе Польшчы літоўскіх эмігрантаў—дэмакратаў і сацыялістаў.

Роля ў гэтай афёры польскіх і часткі літоўскіх сацыялістаў яшчэ раз даводзіць, што ўся гэта публіка фактычна зьяўляецца агентурай Пілсудзкага і яго прыхільнікаў у яго ваенных авантурах, выконваючы ў гэтым выпадку яго загад: «Час скончыць з Літвой».

Чым тлумачыцца гэта ўсё павялічваючаяся за апошні час актыўнасьць Пілсудзкага ў адносінах да Літвы?

Перш за ўсё, самому Пілсудзкаму і яго прыхільнікам патрэбны новыя „перамогі", новыя заваёвы, каб супакоіць усё ўзрастаючае ў краіне незадаволеньне. Пілсудзкі разьлічвае, што свой вельмі падарваны ўнутры краіны прэстыж яму ўдасца падтрымаць новымі «бліскучымі посьпехамі» сваёй армії. Апроч таго пілсудчыне патрэбна Літва, кая разьлічыцца з буйнымі пальскімі абшарнікамі за аказанае імі падтрыманьне. За гэта падтрыманьне польскім паном абяцана «ўзлучэньне Літвы», зварот іх маёнткаў, якія зараз знаходзяцца ў літоўскіх сялян.

Але галоўнае гэта тое, што невалежная Літва зьяўляецца сур'ёзнай перашкодай у ажыцьцяўленьні таго пляну наступу на СССР, які распрацоўваецца супольна ў Лёндане і ў Варшаве.

Надзеі на гегемонію Польшчы ў Прыбалтыцы ў Пілсу зкага ўсё зьмяншаюцца і зьмяншаюцца. Спробы Лёндану замірыць Польшчу з Нямеччынай ніякіх вынікаў не далі. Таму патрэбны рашучыя меры, каб узмацніць сваё становішча ў Прыбалтыцы, каб прымусіць Нямеччыну быць больш згаворлівай, і каб зьнішчыць тыя абцугі, якімі ва ўзлучэньні польскай ваеншчыны зьяўляецца Нямеччына, Літва і Польшча. А для гэтага неабходна зьнішчыць незалежную Літву, гэты «мост» паміж Нямеччынай і Польшчай.

Вось чаму захопніцкая палітыка Пілсудзкага ў адносінах да Літвы спатыкае гэткае падтрыманьне ў Лёндане; таму скаргі літоўскага ўраду Лізе Нацый не даюць ніякіх вынікаў.

Але менавіта з гэтай прычыны СССР ня можа заставацца спакойным гледачом таго, як Пілсудзкі пачынае разгортваць сваю захопніцкую „ўсходнюю" палітыку. І гэту палітыку не замаскоўць ні ўпэўненьні пана Патэка ў міралюбстве Польшчы, ні дэкларацыі прадстаўнікоў Пілсудзкага ў Лізе Нацый аб неабходнасьці «забараніць назаўсёды якія-б там ні было войны».

Падрыхтоўваемы ў сучасны момант пілсудчынай захоп Літвы зьяўляецца вельмі сур'ёзнай пагрозай сьвету і ўзмацняе ваенную небясьпеку. І працоўныя нашай краіны будуць вельмі ўважліва сачыць за чынпасьцю Пілсудзкага і яго агентаў, выконваючых волю Лянцану, памятаючы, што ўдар на Літве, гэта—падрыхтоўка наступу на СССР.

Клясавая вайна ў Нямеччыне.

Лёкаўт 130.000 рабочых-тытунёўшчыкаў.

БЭРЛІН, 13-XI. У зьвязку з няўдачаю апошніх спроб міністэрства працы дамагчыся згоды між прадпрыёмцамі і рабочымі цыгарных фабрык, з заўтрашняга дню прадпрыёмцы зачыняюць усе цыгарныя фабрыкі ў Нямеччыне. Лёкаўт ахапляе 130 тысяч рабочых.

Барацьба ў рэйнскай тэкстыльнай прамысловасьці.

БЭРЛІН, 13-XI. Прадпрыёмцы рэйнска-тэкстыльнае прамысловасьці згадзіліся выканаць трацейскую пастанову, ухваленую ў зьвязку з канфліктам між прадпрыёмцамі і рабочымі. Рабочыя арганізацыі павінны сёньня вырашыць пытаньне аб сваіх адносінах да трацейскага вырашэньня.

Як думаюць, рабочыя адхіляць трацейскую пастанову і ў гэтым выпадку яна будзе абвешчана абавязковаю,

Французская кампартыя асудзіла трацкізм.

Апазіцыянэр Трэн выключан з ЦК.

ПАРЫЖ, 12-11. «Юманітэ» агалашае ўхваленую 9 лістапада цэнтральным камітэтам французкае камуністычнае партыі рэзалюцыю наконт фракцыйнае дзейнасьці апазіцыі. Цалкам ухваляючы зацьверджаныя УсеКП(б) і Камінтэрнам меры проці лідэраў апазіцыі, асабліва аб выключэньні Троцкага і Зіноўева з ЦК УсеКП(б), цэнтральны камітэт французкае камуністычнае партыі залуляе, што апазіцыя ва Ўсе КП(б) імкнецца надаць сваёй фракцыйнай антыпартыйнай працы міжнародны характар, супрацоўнічаючы з Рут Фішэр, Масловым, Суварыным і Монатам.

У Францыі Трэн ад часу свайго зваротту ня спыняў фракцыйнае працы.

ЦК настаўляе **выключыць Трэна з складу ЦК** і заўляе, што гэтая мера павінна разглядацца, як апошняе папярэджаньне. Разам з тым, ЦК французкае кампартыі просіць Камінтэрн выключыць Трэна з выканкому Камінтэрну. ЦК прапануе Трэну, Бару, Факасаву, а таксама Дельфошу і яго прыхільнікам, якія публічна фракцыйным парадкам салідалізаваліся з апазіцыяй УсеКП(б), неадкладна спыніць усякую фракцыйную працу, і заўляе, што ў адваротным выпадку справа аб іх будзе перададзена ў цэнтральную кантрольную камісію дзеля выключэньня іх з партыі.

Журналіст Біттэль аб СССР.

ТОКІЁ, 13-11. Перад ад'ездам з Японіі дырэктар «Юнайтэд Прэс» Біттэль меў з супрацоўнікам «Джапан Адвэртэйзэр» гутарку, у якой заявіў: «Багацьце Расеі складаецца з нафты. Адносіны некаторых дзяржаў да СССР вызначаюцца міжнароднай нафтавай гульнёю, бо расейскія месторады маюць рашаючае значэньне для заўладаньня сусьветным нафтавым рынкам».

Далей Біттэль заявіў, што СССР раней усяго імкнецца ўхіліцца вайны і ня мае ніякіх агрэсыўных намераў у Манчжурыі. Потым Біттэль зазначыў, што размовы аб расейскай прапагандзе звычайна значна перавышаюць яе разьмеры. Водлуг слоў Біттэля, цэнзура ў Маскве існуе толькі намінальна і дае чужаземным карэспандэнтам вялікую волю.

У канцы Біттэль заявіў, што ўмовы жыцьця ў СССР і становішча жыхарства сьведчаць аб значным прагрэсе.

Вакол белагвардзейскіх оясчынстваў у Кітаі.

Няправільнае паведамленьне японскага друку аб нападзе на Чаркасава.

ПЕКІН, 12-11. Выявілася, што паведамленьне японскага друку аб затрыманьні японскім паліцэйскім белагвардзейца Ярохіна, які рабіў замах на сэкратара консульства ў Дайрэне Чаркасава, не адпавадае сапраўднасьці. Наадварот, японская паліцыя выявіла поўную незацікаўленасьць. Ярохін быў затрыман прыватным кітайскім грамадзянінам. Параненага Чаркасава прывёз у больніцу прыватны японскі грамадзянін. У дзьвюх японскіх больніцах параненага адмовіліся прыняць.

Жонка Чаркасава паслала ў японскія газэты адхіленьне агалошанага імі няправільнага паведамленьня. Газэты адмовіліся яго надрукаваць.

НОВАЯ СПРАВА ПРОЦІ Т. САНТО.

ВЕНА, 12-XI. Проці Санто і некаторых іншых засуджаных разам з ім таварышоў будапэшцкая пракуратура ўзьняла новую справу. Прычынаю абвінавачаньня была наладжаная падсудными на судзе дэманстрацыя ў чэсьць СССР у адзнаку 10-ых угодак Кастрычнікавае рэвалюцыі, а таксама прывітальныя выгукі па адрасе Камінтэрну і УсеКП, якімі яны спатка-ці суд.

Матч Алёхін—Капабланка.

БУЭНОС-АЙРЭС, 12-XI. Адкладзеная пасьля 40 хадоў 28-ая партыя матчу скончылася ў нічыю пасьля 43-х хадоў. Кажуць, што Капабланка прапанаваў спыніць матч і аднавіць яго ў будучым годзе ў іншым месцы. Шахматны клюб Арґентыны адхіліў аднак гэтую прапанову і абавязаўся даць дадатковыя сродкі для магчымасьці дакончыць матч да канца.

Капабланка пасьлаў Маншэтынскаму шахматнаму клюбу ў Нью-Ёрку ліст, у якім ён прызнае, што гуляе лепш, чымся чакаў і цьвёрда пастанавіў згуліць з Алёхіным праз некаторы час другі матч.

Гутарка генэральнага сэкратара УсеКП(б) тав. Сталіна

З ЧУЖАЗЕМНЫМІ РАБОЧЫМІ ДЭЛЕГАЦЫЯМІ 5-га ЛІСТАПАДА 1927 ГОДУ.

Прысутнічае 89 ДЭЛЕГАТАЎ ад Нямеччыны, Францыі, Аўстрыі, Чэха-Славакіі, Паўднёвае Амэрыкі, Кітаю, Бэльгіі, Фінляндыі, Даніі і Эстоніі. Гутарка цягнецца 6 гадзін.

СТАЛІН: Таварышы, учора надаслалі мне сьпіс запытаньняў на нямецкай мове бяз подпісу. Сёньня раніцою атрымаў два новыя сьпісы: адзін ад французкае дэлегацыі, другі—ад дацкае. Пачнём з першага сьпісу пытаньняў, хоць і невядома, ад якой дэлегацыі надасланы гэты сьпіс. Потым можна перайсьці да наступных двух сьпісаў. Калі не пярэчыце, пачнём. (Дэлегаты выказваюць згоду).

1-Е ЗАПЫТАНЬНЕ: Чаму СССР не бярэ ўдзелу ў Лізе Нацый?

АДКАЗ: Аб прычынах няўдзелу Савецкага Саюзу ў Лізе Нацый ня раз пісалася ў нашым друку. Я мог-бы адзначыць некаторыя з гэтых прычын.

Савецкі Саюз не зьяўляецца членам Лігі Нацый і не бярэ ўдзелу ў Лізе Нацый таму, **што раней усяго**, ён ня хоча брацьць на сябе адказнасьці за імпэрыялістычную палітыку Лігі Нацый, за «мандаты», якія выдаюцца Лігаю Нацый ва экспэдатацыю і грыгнечаньне калёніяльных краёў. Савецкі Саюз не бярэ ўдзелу ў Лізе Нацый, бо ён настроен цалкам і поўнасьцю проці імпэрыялізму, проці прыгнечаньня калёній і залежных краёў.

Савецкі Саюз ня ўдзельнічае ў Лізе Нацый таму, **падругое**, што ён ня хоча брацьць на сябе адказнасьці за тыя ваенныя падрыхтаваньні, за рост узброеньняў, за новыя ваенныя саюзы і г. д., якія прыкрывае Ліга Нацый і якія вядуць да новых імпэрыялістычных войнаў. Савецкі Саюз ня ўдзельнічае ў Лізе Нацый, бо ён цалкам проці імпэрыялістычных войнаў.

Урэшце, Савецкі Саюз ня ўдзельнічае ў Лізе Нацый таму, што ён ня хоча быць адною з частак таго полагу імпэрыялістычных махінацый, якія зьяўляецца Ліга Нацый, і якія прыкрывае салодкімі прамовамі сваіх членаў. **Ліга Нацый гэта „дом спатканьняў" для імпэрыялістычных заправіл, якія робяць свае справы за кулісамі.** Тое, аб чым гаворацьць афіцыйна ў Лізе Нацый, уяўляе сабою пустую балбатню, разьлічаную на ашуканства рабочых. А тое, што неафіцыйна робяць імпэрыялістычныя заправілы за кулісамі Лігі Нацый, гэта ёсьць імпэрыялістычная праўда, фарысэйскі прыкрываемая красамоўнымі прамоўцамі Лігі Нацый.

Што-ж можа быць дзіўнага ў тым, што Савецкі Саюз ня хоча быць членам і ўдзельнікам гэтае авантурнае калегіі?

2-Е ЗАПЫТАНЬНЕ: Чаму ў Савецкім Саюзе ня церпяць сацыял-дэмакратычную партыю?

АДКАЗ: Сацыял-дэмакратычную партыю (г. з. меншавікоў) ня церпяць у Савецкім Саюзе таму-ж, чаму ня церпяць у нас і контр-рэвалюцыянэраў. Можа гэта дзівіць вас, але ў гэтым няма нічога дзіўнага. Умовы разьвіцьця нашага краю, гісторыя яго разьвіцьця гэткая, што сацыял-дэмакратыя, якая была пры царскім рэжыме больш ці менш рэвалюцыйнаю партыяй, пасьля скасаваньня царызму, пры Керанскім, стала партыяй урадавай, партыяй буржуазнай, партыяй імпэрыялістычнае вайны, а пасьля Кастрычнікавае рэвалюцыі абярнулася ў партыю адкрытае контр-рэвалюцыі проці дыктатуры пралетарыяту. Вы ня можаце ня ведаць, што сацыял-дэмакратыя ў нас брала ўдзел у грамадзянскай вайне на баку Калчака, Дзянікіна проці савецкае ўлады. Зараз гэтая партыя зьяўляецца партыяй рэстаўрацыі капіталізму, партыяй скасаваньня дыктатуры пралетарыяту.

Я думаю, што такая эвалюцыя сацыял-дэмакратыі зьяўляецца тыповаю для яе ня толькі ў СССР але і ў іншых краёх. Сацыял-дэмакратыя была ў нас больш ці менш рэвалюцыйнаю, пакуль існаваў царскі рэжым. Гэтым уласна і тлумачыцца, што мы, бальшавікі, складалі тады з меншавікамі, г. зн. з сацыял-дэмакратыяй, адну партыю.

Сацыял-дэмакратыя становіцца партыяй апазіцыйнай, або ўрадавай, буржуазнай, калі прыходзіць да ўлады так званая дэмакратычная буржуазея. **Сацыял-дэмакратыя ператвараецца ў партыю адкрытае контр-рэвалюцыі, калі ўлада пераходзіць у рукі рэвалюцыйнага пралетарыяту.**

АДЗІН З ДЭЛЕГАТАЎ: ці значыць гэта, што сацыял-дэмакратыя толькі тут, у СССР, зьяўляецца контр-рэвалюцыйнаю сілаю, ці мо' ў іншых краёх яна таксама можа быць кваліфікавана, як контр-рэвалюцыйная сіла?

СТАЛІН. Я ўжо казаў, што мы маем тут некаторую розьніцу. Сацыял-дэмакратыя ў краі дыктатуры пралетарыяту зьяўляецца сілаю контр-рэвалюцыйнаю, якая дамагаецца аднаўленьня капіталізму і скасаваньня дыктатуры пралетарыяту ў імя буржуазнае «дэмакратыі». У краёх капіталістычных, дзе няма ўлады пралетарыяту, сацыял-дэмакратыя зьяўляецца або партыяй апазіцыйнаю, або партыяй напалову ўрадаваю, якая ўступае ў саюз з лібэральнай буржуазэяй проці найбольш рэакцыйных сіл капіталізму, або партыяй урадаваю, да канца, проста і адкрыта баронячаю капіталізм і буржуазную «дэмакратыю» проці рэвалюцыйнага руху пралетарыяту. Яна робіцца адкрыта контр-рэвалюцыйнаю, яе контр-рэвалюцыйнасьць накіроўваецца проці ўлады пралетарыяту толькі пасьля таго, калі ўлада пралетарыяту становіцца сапраўднасьцю.

3-е ЗАПЫТАНЬНЕ: Чаму няма волі друку ў СССР?

АДКАЗ: Аб якой волі друку вы гаворыце? Воля друку для якое клясы—для буржуазеі, ці для пралетарыяту? Калі гутарка ідзе аб волі друку для буржуазеі, дык яе няма ў нас і ня будзе, пакуль існуе дыктатура пралетарыяту. Калі-ж гутарка ідзе аб волі друку для пралетарыяту, дык я павінен сказаць, што **вы ня знойдзеце ў сьвеце другое дзяржавы, дзе-б існавала такая ўсебаковая і шырокая воля друку для пралетарыяту, якая існуе ў СССР.** Воля друку для пралетарыяту—ня ёсьць пустое слова. Бяз лепшых друкарняў, лепшых дамоў друку, без адкрытых арганізацый рабочае клясы ад самых вузкіх, да самых шырокіх, ахопліваючых мілёны рабочае клясы, бяз самае шырокае волі сходаў,—волі друку ня бывае. Прыглядзьцеся да ўмоў жыцьця ў СССР. Агледзьце рабочыя райёны, і вы зразумееце, што лепшыя друкарні, лепшыя дамы друку, цэлыя фабрыкі паперы, цэлыя заводы сродкаў, неабходных для друку, вялізныя палацы для сходаў,—усё гэта і шмат іншага, неабходнага для волі друку, рабочае клясы знаходзіцца цалкам і поўнасьцю ў руках рабочае клясы і працоўных мас. Гэта і называецца ў нас воляю друку для рабочае клясы.

У нас няма волі друку для буржуазеі. У нас няма волі друку для меншавікоў, эсэраў, якія ўяўляюць у нас інтарэсы разьбітае і скінутае буржуазеі. Але што-ж тут дзіўнага? Мы ніколі ня бралі на сябе абавязацельства даць волю друку іншым клясам, ашчасьлівіць усе клясы. Заваяваўшы ўладу ў 1917 годзе, бальшавікі адкрыта гаварылі, што гэтая ўлада ёсьць толькі ўлада аднае клясы, улада пралетарыяту, якая будзе ўціскаць буржуазею ў інтарэсах працоўных мас гораду і вёскі, складаючых пераважную большасьць жыхарства ў СССР. Як можна пасьля гэтага вымагаць ад пралетарскае дыктатуры волі друку для буржуазеі?

4-е ЗАПЫТАНЬНЕ: Чаму не вызваляюць з астрогу зьняволеных меншавікоў?

АДКАЗ: Гутарка ідзе, як відаць, аб актыўных меншавікох. Так, гэта праўдзіва; актыўных меншавікоў у нас ня выпушчаюць з астрогу да канца тэрміну адсідкі. Але, што-ж тут дзіўнага? А чаму ня выпушчалі з астрогу, напрыклад, бальшавікоў у ліпені, жніўні, верасьні і кастрычніку 1917 году, калі ўлада была ў руках меншавікоў і эсэраў? Чым тлумачыцца, што вялікі Ленін, імя якога было сьцягам для пралетарыяту усіх краёў, прымушан быў хавацца ў ліпені-кастрычніку 1917 г. ў Фінляндыі, далёка ад «дэмакратычнае рэспублікі» Керанскага і Цэрэтэлі, Чарнова і Дана, а орган друку партыі Леніна «Правда»—быў разгромлен юнкерамі, не зважаючы на тое, што на чале ўраду сталі тады вядомыя актывісты 2-га Інтэрнацыяналу? Тлумачыцца ўсё гэта, як відаць, тым, што барацьба між буржуазнай контр-рэвалюцыяй і пралетарскай рэвалюцыяй ня можа ня прывесьці да вядомых рэпрэсій.

Я ўжо казаў, што сацыял-дэмакратыя зьяўляецца ў нас партыяй контр-рэвалюцыйнай. Але гэта значыць, што пралетарская рэвалюцыя ня можа абыйсьціся без таго, каб не арыштоўваць дзеячоў гэтае контр-рэвалюцыйнае партыі. Гэта ня ўсё. З гэтага выходзіць далей, што арышт меншавікоў зьяўляецца ў нас прадметам палітыкі Кастрычнікавае рэвалюцыі. І сапраўды, што такое Кастрычнікавая рэвалюцыя? Кастрычнікавая рэвалюцыя азначае раней усяго скасаваньне ўлады буржуазеі. Цяпер усе больш ці менш сьвядомыя рабочыя ўсіх краёў прызнаюць, што бальшавікі зрабілі правільна, скінуўшы ўладу буржуазеі ў кастрычніку 1917 году. Я перакананы, што вы трымаецеся таго-ж погляду.

Але вось пытаньне каго-ж, уласна, скідаў пралетарыят у кастрычніку 1917 году? Гісторыя гаворыць, факты сьведчаць, што ў кастрычніку 1917 г. пралетарыят скідаў меншавікоў і эсэраў, бо ўласна меншавікі і эсэры, Керанскі і Чарноў, Гоц і Лібэр, Дан і Цэрэтэлі, Абрамовіч і Аўксэньцяў сталі тады ля ўлады.

А што з сябе ўяўляюць партыі меншавікоў і эсэраў? Гэта ёсьць партыі другога Інтэрнацыяналу. Выходзіць, такім чынам, што, робячы Кастрычнікавую рэвалюцыю, пралетарыят СССР скідаў партыі 2-га Інтэрнацыяналу. Гэта можа і няпрыемна каму-небудзь з сацыял-дэмакратаў, але гэта бязумоўны факт, таварышы, проці якога было-б сьмешна спрачацца. Значыць, выходзіць, што ў момант пралетарскае рэвалюцыі можна і патрэбна скідаць уладу меншавікоў і эсэраў для таго, каб магла перамагчы ўлада пралетарыяту. Але калі іх можна скідаць, дык чаму-ж нельга іх арыштоўваць, калі яны пераходзяць адкрыта ў лягер буржуазнае контр-рэвалюцыі? Ці думаеце вы, што скасаваньне меншавікоў і эсэраў зьяўляецца менш моцным сродкам, чымся іх арышт? Нельга лічыць правільнаю палітыку Кастрычнікавае рэвалюцыі, ня лічачы разам з тым правільнымі яе няўхільныя вынікі. Адно з двух: або Кастрычнікавая рэвалюцыя была памылкаю—і тады такою-ж памылкаю зьяўляецца арышт меншавікоў і эсэраў, або Кастрычнікавая рэвалюцыя ня ёсьць памылка, і тады нельга лічыць памылкаю арышт меншавікоў і эсэраў. Лёгіка даказвае.

5-е ЗАПЫТАНЬНЕ: Чаму карэспандэнт сацыял-дэмакратычнага бюро прэсы не атрымаў дазволу на выезд у СССР?

АДКАЗ. Таму, што сацыял-дэмакратычная прэса заграніцаю, асабліва «Форвэртс», неправысіла сваім паклёпам на СССР і яе прадстаўнікоў цэлы шэраг іншых газэт. Таму, што шмат буржуазных газэт, накшталт «Фосіншэ Цэйтунг», трымае сябе ў барацьбе з СССР куды больш «аб'ектыўна» і «прызваіта», чымся «Форвэртс». Гэта можа паказацца дзіўным, але гэта факт, з якім нельга ня лічыцца. Калі-б «Форвэртс» трымаў сябе ня горш некаторых буржуазных газэт, дык яго прадстаўнікі, напэўна, атрымалі-б сваё месца ў СССР побач з іншымі прадстаўнікамі буржуазных газэт. Гэтымі днямі адзін з прадстаўнікоў «Форвэртс» зьвярнуўся да аднаго з супрацоўнікаў нашага дыпляматычнага прадстаўніцтва ў Бэрліне з запытаньнем аб умовах, неабходных для таго, каб карэспандэнт «Форвэртса» мог атрымаць дазвол на выезд у СССР. У адказ на гэта яму сказалі: Калі «Форвэртс» дакажа на справе, што ён гатоў трымаць сябе ў адносінах да СССР і яго прадстаўнікоў ня горш, чымся „прызваітыя» лібэральныя газэты, накшталт «Фосіншэ Цэйтунг», дык савецкі ўрад ня будзе пярэчыць проці дазволу на выезд карэспандэнту «Форвэртса» ў СССР. Я думаю, што адказ цалкам зразумелы.

6-е ЗАПЫТАНЬНЕ: Ці магчыма аб'яднаньне 2-го і 3-га Інтэрнацыяналаў?

АДКАЗ. Я думаю, што немагчыма—немагчыма таму, што II-гі і III-ці Інтэрнацыяналы маюць дзьве вусім розныя ўстаноўкі і глядзяць у розныя бакі. Калі III-ці Інтэрнацыянал глядзіць у бок скасаваньня капіталізму і ўстанаўленьня дыктэтуры пралетарыяту, дык 2-гі Інтэрнацыянал, наадварот, глядзіць у бок захаваньня капіталізму і зруйнаваньня ўсяго таго, што неабходна для заснаваньня дыктатуры пралетарыяту. Барацьба між гэтымі двума Інтэрнацыяналамі зьяўляецца апошнім адбіткам барацьбы між прыхільнікамі капіталізму і прыхільнікамі сацыялізму. У гэтай барацьбе павінны перамагчы або 2-гі, або 3-ці Інтэрнацыянал. Можна з упэўненасьцю сказаць, што пераможа ў рабочым руху 3-ці Інтэрнацыянал. Я лічу іх аб'яднаньне немагчымым.

7-Е ЗАПЫТАНЬНЕ. Як ацэньваецца становішча ў Заходняй Эўропе? Ці трэба спадзявацца на рэвалюцыйныя падзеі ў бліжэйшыя гады?

АДКАЗ. Я думаю, што ў Эўропе нарастаюць і будуць нарастаць элементы найглыбейшага крызісу капіталізму. Капіталізм можа часткова стабілізавацца, можа рацыяналізаваць сваю вытворчасьць, можа ўціснуць часова рабочую клясу,—усё гэта капіталізм пакуль-што можа зрабіць; але ён ніколі ня вернецца да тае ўстойчывасьці і да тае «роўнавагі», якія існавалі да сусьветнае вайны і Кастрычнікавае рэвалюцыі. Ніколі ён да тае «ўстойчывасьці» і «роўнавагі» ня вернецца больш. А што гэта так, дык гэта відаць хоць-бы з таго, што ў краёх Эўропы, таксама як і ў калёніях, якія зьяўляюцца крыніцаю існаваньня эўрапейскага капіталізму, у ходзе справы прарываюцца агні рэвалюцыі. Сёньня ў Аўстрыі паказваецца агонь рэвалюцыі, заўтра—у Англіі, пазаўтра—дзе-небудзь у Францыі ці Нямеччыне, потым у Кітаі, Індыі і г. д.

Што такое Эўропа і калёніі? Гэта ёсьць цэнтр і перыфэрыя капіталізму. «Неспакойна» ў цэнтрах эўрапейскага капіталізму. Яшчэ больш «неспакойна» на яго перыфэрыі. Насьпяваюць умовы для новых рэвалюцыйных падзей. Я думаю, што найбольш яскравым паказальнікам крызісу капіталізму, найбольш яскравым прыкладам незадаволеньня і абурэньня рабочае клясы зьяўляюцца падзеі, зьвязаныя з забойствам Сако і Ванцэці. Што такое забойства двух рабочых для капіталістычнае мясасечкі? Ці-ж рабочых не забівалі да гэтае пары дзесяткамі і сотнямі штотыдзень? Між тым даволі было забойства двух рабочых Сако і Ванцэці, каб прывесьці ў рух рабочую клясу ўсяго сьвету. Аб чым гэта гаворыць? Аб тым, што глеба пад нагамі капіталізму робіцца ўсё больш і больш гарачаю. Аб тым, што нарастаюць умовы для рэвалюцыйных падзей. Той факт, што капіталістам можа ўдасца прыдушыць першую хвалю рэвалюцыйнага выбуху, ні ў якой меры ня можа служыць уцехаю для капіталізму. **Рэвалюцыя проці капіталізму ня можа пасоўвацца адною агульнаю суцэльнаю хваляю. Яна нарастае заўсёды ў парадку прыліваў і адліваў.** Так было ў Расеі, так будзе ў Эўропе. **Мы стаім перад новымі рэвалюцыйнымі падзеямі.**

8-Е ЗАПЫТАНЬНЕ. Ці зьяўляецца моцнаю апазіцыя ў расейскай партыі? На якія колы яна абапіраецца.

АДКАЗ. Я думаю, што яна вельмі слабая. Больш таго, яе сілы амаль нікчэмныя ў нашай партыі. У мяне ў руках сёньнешняя газэта. Там падрахаваны вынікі за некалькі дзён дыскусіі. Лічбы гавораць, што за цэнтральны камітэт нашае партыі і яго тэзісы галасавала звыш 135 тысяч членаў партыі, за апазіцыю—1200 членаў партыі. Гэта не складае нават і 1 пр. Я думаю, што далейшае галасаваньне пакажа яшчэ больш скандальныя вынікі для апазіцыі. Дыскусія ў нас будзе цягнуцца да самага зьезду. Мы пастараемся за гэты час апытаць па магчымасьці ўсю партыю. Я ня ведаю, як у вас, у сацыял-дэмакратычных партыях вядуць дыскусію. Я ня ведаю, ці наогул вядуць дыскусію ў сацыял-дэмакратычных партыях. Мы апытаем усю партыю і вы ўбачыце, што ўдзельная вага апазіцыі ў нашай партыі будзе яшчэ больш нікчэмнаю, чымся паказаньні толькі-што агалошаных лічбаў. Вельмі магчыма, што на 15-м зьезьдзе нашае партыі апазіцыя ня будзе мець ніводнага прадстаўніка, ніводнага дэлегата. Возьмем, напрыклад, хоць-бы такія вялікія прадпрыемствы, як «Треугольник» ці «Путиловец» у Ленінградзе. Лік рабочых на «Треугольнике» даходзіць да 15 тысяч. Членаў партыі там—2122. Галасавала за апазіцыю 39. Лік рабочых на «Путиловцу»—каля 11 тысяч. Членаў партыі—1718. Галасавалі за апазіцыю—29.

На якія колы абапіраецца апазіцыя? Я думаю, што апазіцыя абапіраецца, галоўным чынам, на непралетарскія колы. Калі запытаць непралетарскія гушчы жыхарства, тых, хто незадаволены рэжымам дыктатуры пралетарыяту, каму яны спачуваюць,—дык яны бяз ваганьня адкажуць, што яны спачуваюць апазіцыі. Чаму? Таму што барацьба апазіцыі ёсьць, па сутнасьці справы, барацьба проці партыі, барацьба проці рэжыму дыктатуры пралетарыяту, якім ня могуць быць задаволены вядомыя непралетарскія колы. Апазіцыя, гэта—адбітак незадаволеньня, адбітак напору непралетарскіх колаў жыхарства на дыктатуру пралетарыяту.

9-е ЗАПЫТАНЬНЕ. Ці зьяўляецца правільным заявленьне, якое распаўсюджваецца ў Нямеччыне Рут Фішэр і Маславым аб тым, што сучаснае кіраўніцтва Камінтэрну і расейскае партыі выдае рабочых контррэвалюцыі?

АДКАЗ. Трэба думаць, што правільна, трэба думаць, што Камінтэрн і УсеКП(б) выдаюць з галавою рабочую клясу СССР контррэвалюцыянэрам усіх краёў. Больш таго, я магу вам паведаміць, што Камінтэрн і УсеКП(б) пастанавілі гэтымі днямі вярнуць у СССР усіх выгнаных з нашага краю абшарнікаў і капіталістаў і вярнуць ім фабрыкі і заводы. І гэта ня ўсё: Камінтэрн і УсеКП(б) пашлі і далей, пастанавіўшы, што прышоў час перайсьці бальшавікам да харчаваньня чалавечым мясам. Урэшце, у нас ёсьць пастанова нацыяналізаваць усіх жанчын і дзяцей і ўвесьці практыку згвалтаваньня сваіх уласных сясьцёр. (Сьмех; агульныя выгукі: **Хто мог задаць такое запытаньне**). Я бачу, што вы сьмяцеся, магчыма, што хтонебудзь з вас падумае, што я адпушчаю нясур'ёзна да гэтага запытаньня. Але, таварышы, **нельга сур'ёзна адказваць на гэткія запытаньні.** Я думаю, што на гэткія запытаньні можна адказваць толькі насьмешкаю. (Гучныя воплескі).

10-е ЗАПЫТАНЬНЕ. Якія ў вас адносіны да апазіцыі і да напрамку Рут Фішэр—Маслаў і Нямеччыне?

АДКАЗ. Мае адносіны да апазіцыі і да яе агентуры ў Нямеччыне такія-ж, як і адносіны вядомага французкага раманіста Альфонса Додэ да Тартарэна з Тараскона (вясёлае ажыўленьне сярод дэлегатаў). Вы, як відаць, чыталі гэты вядомы раман Альфонса Додэ аб Тартарэне і Тарасконе. Герой гэтага раману Тартарэн быў, па сутнасьці справы, звычайны «добры» дробны буржуа. Але фантазія ў яго была нястрыманая, а здольнасьці „маніць добрадушна" былі разьвіты да таго, што ён стаў, урэшце, ахвярай гэтых вялікіх здольнасьцяў. Тартарэн заявіраў усіх, што ён забіў у горах Атласа вялікую колькасьць львоў і тыграў. Лёгкаверныя прыяцелі Тартарэна надалі яму за гэтае назву першага ў сьвеце паляўнічага на львоў. А між тым, Альфонс Додэ ведаў напэўна, што як і ён сам, так і Тартарэн ніколі ня бачыў ні львоў, ні тыграў. Тартарэн хваліўся і запэўняў усіх, што ён узьнімаўся на Манблян. Яго лёгкаверныя прыяцелі надалі яму за гэта імя першага ў сьвеце альпэніста. А між тым Альфонс Додэ ведаў напэўна, што ніякага Манбляну Тартарэн ня бачыў ніколі, бо ён усяго толькі набываў каля падгор'я Манбляну. Тартарэн хваліўся, што ён заснаваў вялікую калёнію ў краі, далёкім ад Францыі. Лёгкаверныя прыяцелі надалі яму за гэта імя першага ў сьвеце калёнізатара. А між тым, Альфонс Додэ напэўна ведаў, таксама як павінен быў ведаць і сам Тартарэн, што нічога, акрамя канфузу, не магло выйсьці з фантастычных замыслаў Тартарэна. Вы ведаеце, да якога канфузу і скандалу для тартарэнцаў прывядуць фантастычныя замыслы Тартарэна. Я

Кангрэс прыяцеляў СССР.

КАНГРЭС ПРЫЗНАЎ СССР БАЦЬКАЎШЧЫНАЮ СУСЬВЕТНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ, КРАЕМ УЗРАСТАЮЧАГА САЦЫЯЛІЗМУ. КАНГРЭС КЛІЧА МІЖНАРОДНУЮ РАБОЧУЮ КЛЯСУ І ПРАЦОЎНУЮ ІНТЭЛІГЕНЦЫЮ БАРАНІЦЬ СССР.

КАНГРЭС ПА АБАРОНЕ РАБОЧАЕ РЭСПУБЛІКІ.

Рэзалюцыя па дакладзе Рыкава.

МАСКВА. На ранішнім пасяджэньні кангрэсу прыяцеляў СССР 12-га лістапада адбываліся далей спрэчкі па дакладзе Рыкава.

Пасьля выступленьняў МАРУФА (Алжыр) і КАЗАНЗАКІСА (Грэцыя) падаецца і ўхваляецца прапанова спыніць спрэчкі. Галасаваньнем аднагодна ўхваляецца рэзалюцыя па дакладзе Рыкава. Делегацыі-удзельніці кангрэсу—заўляюць у рэзалюцыі аб ЦЬВЁРДАЙ САЛІДАРНАСЬЦІ З РАБОЧЫМІ І СЯЛЯНАМІ СССР, якія распачалі справу ператварэньня грамады на сацыялістычных асновах, і ВЫКАЗВАЮЦЬ ГАТОЎНАСЬЦЬ АБАРАНЯЦЬ ЗАВАЁВЫ КАСТРЫЧНІКАВАЕ РЭВАЛЮЦЫІ ад імпэрыялістычных пасяганьняў капіталістычных краёў. Удзельнікі кангрэсу бяруць на сябе АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВА ВЫКРЫЦЬ ІНТРЫГІ МІЖНАРОДНАЕ ДЫПЛЁМАТЫІ, якая падрыхтоўвае вайну проці СССР, выступаць ПРОЦІ РАЗРЫВУ зносін СССР, ДАМАГАЦЬЦА ПРЫЗНАНЬНЯ СССР іхнімі ўрадамі, ПАДТРЫМЛІВАЦЬ усюды накіраваную да разброеньня ініцыятыву СССР, змагацца ЗА АДЗІНСТВА ПРАФСАЮЗНАГА РУХУ ў нацыянальным і міжнародным абхваце.

За міжнар. плян дзеяньня ў абарону СССР.

Пасьля ўхвалы рэзалюцыі па дакладзе Рыкава Джагер (Англія) выступіў з дакладам на пытаньні аб небясьпецы вайны. Падкрэсьліўшы, што ўзброеньні ідуць поўным ходам, прамоўца зазначыў, што пікі ў надыходзячай вайне будуць накіраваны проці СССР, бо адначасна з ростам крызісу на капіталістычных рынках і канкурэнцыі з рук капіталістаў высьлізнулася шостая частка сьвету.

Трэба, кажа прамоўца, **распрацаваць падрабязны плян дзеяньня**, узяць на сябе абавязацельства дамагчыся ўхвалы яго рознымі арганізацыямі і шырока прапагандаваць гэты плян.

Выступленьне Барбюса.

Выступіўшы далей **Барбюс** зазначыў, што самае існаваньне СССР зьяўляецца пасягацельствам на брытанскі імпэрыялізм, а таксама на ўсіх, гатовых дзейнічаць за адно з ім. Падзеі апошняга часу, кажа Барбюс, сьведчаць, што даволі якога-небудзь непаразуменьня, каб узьнікла вайна; непаразуменьне-ж гэтае імкнуцца спраакаваць. Трэба абараняць сацыялістычную дзяржаву ад паклёпнікаў, кажа нарэшце Барбюс, абараняць ад яе руйнавацеляў. Гэта дзьве непарыўныя часткі аднае задачы. Даволі міжнародным працоўным масам выразна зразумець, што тут ставіцца на карту, каб яны распачалі дзейнічаць пасьлядоўна. Гэтыя масы, сьвядомасьць і сіла якіх расьце, зьяўляюцца найлепшаю апораю СССР у будучыне.

Канграс наладзіў Барбюсу бурную авацыю.

Штодня памятаць аб пагрозе вайны.

Далей выступіў **Томскі**, даклад якога заслухан з выключнаю ўвагаю. Зазначыўшы, што галоўным клясавым ворагам СССР зьяўляецца Англія, Томскі падкрэсьліў слабасьць барацьбы проці вайны адными рэзалюцыямі. Барацьба проці вайны павінна ісьці па двух напрамках: праз штодзённае растлумачэньне рабочым неабходнасьці барацьбы проці імпэрыялізму і **праз заснаваньне братэрскага саюзу рабочых усіх краёў**. Барацьба за адзінства прафруху—адзін з верных спосабаў замаганьня проці імпэрыялізму і вайны. Будучая вайна надыйдзе раптам. З гэтае прычыны нашая задача—**штодня рыхтавацца, каб абярнуць будучую імпэрыялістычную вайну ў вайну грамадзянскую**, няўхільна агітаваць проці нацыяналістычных і шавіністычных ідэй. **Патрэбна пасьлядоўная клясавая барацьба проці імпэрыялізму.**

Пасьля прамовы Томскага ранішняе пасяджэньне зачыняецца.

ДА НАРОДАЎ УСЯГО СЬВЕТУ.

Адозва сусьветнага кангрэсу прыяцеляў СССР.

МАСКВА. На вячэрнім пасяджэньні 12-га лістапада кангрэс прыяцеляў СССР ухваліў аднагодна тэкст адозвы да народаў усяго сьвету.

У адозьве зазначана: „Мы, прадстаўнікі рабочых, грамадзкіх і навуковых арганізацый, сацыял-дэмакраты і беспартыйныя, камуністы і сябры нацыянальна-дэмакратычных партый, прысутныя на кангрэсе прыяцеляў СССР, лічым сваім абавязкам адкрыта заявіць усяму сьвету, што МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА Ў ПРАЦЯГУ АПОШНІХ ГАДОЎ ВЕЛЬМІ ЎСКЛАДНІЛАСЯ. Пасьляваенная палітыка самых буйных імпэрыялістычных дзяржаў выкрыла няшчырасьць сказаў, накшталт „абарона бацькаўшчыны“, „справядлівая вайна“, „апошняя вайна“, „вайна ў абарону волі і прагрэсу“ і інш.

Мы заклікаем сумленных грамадзян усіх краёў сьвету, мы заклікаем усіх рабочых і працоўную інтэлігенцыю, усіх, хто не закуты ў ідэалёгічны ланцуг капіталістаў, НЯШЧАДНА ЗМАГАЦЦА ПРОЦІ ПАДРЫХТОВАК НОВАЕ ВАЙНЫ З СССР І ПРОЦІ РОЗНЫХ НАСКОКАЎ НА КРАЙ ПРАЛЕТАРСКАЕ ДЫКТАТУРЫ, ад чаго-б яны не паходзілі і якімі-б ідэалёгічнымі лёзунгамі не прыкрываліся. МЫ ЛІЧЫМ ВАЙНУ ПРОЦІ СССР ВЯЛІКІМ ЗЛАЧЫНСТВАМ. Гэтая вайна азначала-б паход проці рабочае клясы і сялян Савецкага Саюзу ў інтарэсах інтэрвантаў, уласьнікаў і капіталістаў.

Абвяшчаць вайну проці рабочае дзяржавы,—зазначана далей у адозьве,—значыць прыдушыць храсткі новае культуры, якія ўзыходзяць у краі саветаў, наперакор вялічэзным перашкодам, якія малады, але магутны пралетарыят СССР здолеў перамагчы.

Кангрэс заклікае ўсіх сапраўдных прыхільнікаў спакою перашкаджаць усімі спосабамі новай вайне. Хто абараняе электрычнае крэсла, малпавы працэс проці тэорыі Дарвіна і фашысцкі разгул, той ня можа быць абаронцаю культуры і цывілізацыі. САПРАЎДНЫЯ АБАРОНЦЫ КУЛЬТУРЫ,—ХТО ГЕРАІЧНА ЗМАГАЕЦЦА ПРОЦІ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫХ ВОЙН, якія нішчаць, душаць і руйнуюць усе жывыя сілы чалавецтва.

Проці барбарскіх імпэрыялістычных войн.
Проці палітыкі задушэньня Кітаю.
Проці інтэрвэнцыі ў СССР.

ЗМАГАЙЦЕСЯ. АБАРАНЯЙЦЕ, АХОЎВАЙЦЕ СССР—бацькаўшчыну працоўных, апору спакою, прытулак вызваленьня, крэпасьць сацыялізму—УСІМІ СПОСАБАМІ, УСІМІ СІЛАМІ.

КАМІНТЭРН АЖЫЦЬЦЯЎЛЯЕ МАРКСЫЗМ НА СПРАВЕ.

ЖЫЦЬЦЁ АСУДЗІЛА МІЖНАРОДНЫ МЕНШАВІЗМ ЗА ЯГО АДМОВУ АД КЛЯСАВАЕ БАРАЦЬБЫ.

Прамова тав. Бухарына.

МАСКВА. Уваход Бухарына на трыбуну быў спатканы бурнай авацыяй.

Я хачу, кажа Бухарын, каротка адказаць на запытаньні наконт нашае тактыкі ў рэвалюцыі і наконт тактыкі сацыял-дэмакратыі. Сыняюся на гэтых пытаньнях затым, што ў апошні час нам рабіліся розныя прапановы як у адкрытай, так і ў захаванай форме з боку сацыял-дэмакратычных партый. Зазначу на прамову Отто Баўэра на сьвяце, прысьвечаным угодкам нашае рэвалюцыі. Прамова Баўэра па сутнасьці была непасрэдным зваротам да нас з прапановаю супрацоўніцтва, прычым тут-жа высоўваліся будучыя асновы такога супрацоўніцтва. **Першая ўмова Баўэра**, гэта—«дэмакратызацыя» краю. Усе разумеюць, што гэтае патрабаваньне па сутнасьці зьяўляецца патрабаваньнем ліквідаваць пралетарскую дыктатуру. **Другая прапанова Баўэра**—спыніць самастойнае існаваньне камуністычных партый Заходняй Эўропы, інакш кажучы, ліквідаваць Камінтэрн.

Сацыял-дэмакраты дамагаюцца ад нас новых мэтадаў у пытаньні аб захопе ўлады і патрабуюць новае партыйнае палітыкі.

Сацыял-дэмакраты прабавалі іншыя мэтады, нават мелі свае ўрады, як было ў Аўстрыі, Швэдыі, Англіі і часткаю Бэльгіі. Запытаньне: дзе цяпер гэтыя ўрады з іх заходня-эўрапейскімі эвалюцыянісцкімі і пацыфісцкімі мэтадамі. Усе гэтыя ўрады былі выкінуты вон.

Апошнія довады, з якімі апэруе Отто Баўэр: расейскія мэтады ня годны для Заходняе Эўропы. Відочная памылка, нібы ў нас існуюць нейкія асаблівыя мэтады, якія ня могуць быць перанесены на эўрапейскую глебу. Мы вучні Маркса і Леніна, які зьяўляецца самым пасьлядоўным марксыстым, ня ўжываем якіх-небудзь спэцыяльных мэтадаў.

Ранейшыя сацыял-дэмакраты з Энгельсам на чале былі прыхільнікамі дыктатуры. Мы ажыцьцёвілі гэтую дыктагуру на практыцы. Сацыял-дэмакраты ліквідавалі вучэньне Маркса ў той час, як у нас яно ажыцьцёўлена.

Мы мабілізуем усе сілы,—кажа нарэшце Бухарын,—для барацьбы проці будучае імпэрыялістычнае вайны. Перамога пралетарыяту азначае выратаваньне ўсяго чалавецтва ад заняпаду. Вось чаму на парозе другога 10-цігодзьдзя Кастрычнікавае рэвалюцыі мы абвяшчаем нязьменны покліч да міжнароднага камунізму: **«НЯХАЙ ЖЫВЕ СУСЬВЕТНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ».**

Камсамол Масквы ідзе з ленінскім ЦК партыі.

МАСКВА. У першы дзень абгавору ў камсамольскіх ячэйках Масквы пастаноў канстрычнікавага пленуму ЦК і ЦКК выявіў вялікую актыўнасьць камсамольцаў і паказаў, што маскоўскі камсамол аднадушна стаіць на ленінскіх пазіцыях і дае жалезны адпор раскольнікам-апазіцыянэрам.

11-га лістапада па 4-х раёнах Масквы адбыліся сходы ў 24-х ячэйках камсамолу, на якіх прысутнічала 4.464 чал. Выказалася ў спрэчках 353 чалавека, з іх 49 апазіцыянэраў. За тэзісы і пастановы пленуму ЦК і ЦКК галасавала **4.462 чал.**, проці 46-ці ўстрымалася—40.

Партыйная канфэрэнцыя Беларускай-Вайсковай акругі.

МІЖНАРОДНАЕ І УНУТРАНАЕ СТАНОВІШЧА І ЗАДАЧЫ ПАРТЫІ.*)

(З дакладу т. Уншліхта).

Нашы дасягненьні.

Таварышы! Я пераходжу да другой часткі майго дакладу: аб унутраным становішчы нашай краіны.

XIУ зьезд нашай партыі даў цэнтральнаму Камітэту па гэтаму пытаньню наступныя дырэктывы: у галіне эканамічнага будаўніцтва выходзіць з таго, што наша краіна, дыктатуры пралетарыяту, мае ўсё неабходнае для пабудаваньня сацыялістычнай грамады; зьезд лічыць, што барацьба за перамогу сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР зьяўляецца асноўнай задачай нашай партыі. Справаздачны год упаўне даказаў правільнасьць гэтага палажэньня.

Перад намі сёньня стаяць наступныя пытаньні: ці выканаў ЦК пастановы XIУ партзьезду ў частцы эканамічнага будаўніцтва; ці правільна была палітыка ЦК у галіне гаспадарчага жыцьця, палітыкі і ў вёсцы; парэшце, ці ідзём мы па шляху ажыцьцяўленьня сацыялізму; ці назад да капіталізму, як гэта кажа апазіцыя.

Мы ў бягучым годзе перайшлі даваенную выпрацоўку прадукцыі ў разьмеры 6 проц., а ў 1927-28 годзе гэты процант, на падставе плянаў распрацаваных намі, павялічыцца да 19 проц.

Лік рабочых у буйнай прамысловасьці ў даваенныя часы складаў 2400 тысяч, зараз у дэнзавай нашай прамысловасьці ён дасягае 2469 тысяч, гэта значыць на 2 проц. больш, чым у даваенныя часы. Каменнаўгольная прамысловасьць у мінулым годзе дала прадукцыі на 10 проц. больш, чым у даваенныя часы, а ў 1927-28 годзе гэтае павялічэньне прадукцыі вызначана ў разьмеры 30 проц.

Нафтавая прамысловасьць у будучым годзе перавысіць здабычу да ваеннага часу на 30 проц. Здабыча торфу перавышае даваенную больш, чым у 3 разы.

Асабліва характэрны посьпех у галіне электрыфікацыі. Я кажу «характэрны» таму, што рост колькасьці электраэнэргіі, якая скарыстоўваецца краінай, сьведчыць аб росьце культурных сіл і культурных запатрабаваньняў нашай краіны. У 1913 годзе магутнасьць нашых электрастанцый раўнялася 780 тыс. кілёват, у 1927 годзе магутнасьць нашых электрастанцый складала ўжо 1730 тысяч кілёват, а па праграме на 1927-28 год электрастанцыі дадуць 2130 тысяч кілёват.

Гэтыя лічбы сьведчаць ня толькі аб нашых гаспадарчых дасягненьнях у галіне нашай прамысловасьці, але таксама і аб росьце культуры ў нашай краіне, аб росьце запатрабаваньняў самых шырокіх і самых адсталых слаёў насельніцтва.

Капітальныя затраты па будаўніцтве характарызуюць рост і тэмп індустрыялізацыі краіны, яны паказваюць, у якой ступені мы ўжо ажыцьцяўляем рэканструкцыю ўсёй нашай прамысловасьці і якія ў нашай краіне маюцца рэальныя магчымасьці дзеля таго, каб ісьці па шляху далейшага пашырэньня індустрыялізацыі.

У 1923-24 годзе на будаўніцтва па народнай гаспадарцы было затрачана 467 міл. рублёў, у 1925-26 г. сума павялічваецца да 1485 міл., а ў мінулым годзе яна ўжо дасягала 1492 міл., у 1927-28 годзе вызначана выдаць на будаўніцтва—2333 міл.

У галіне сельскай гаспадаркі лічбы яскрава пацьвярджаюць таксама нашы дасягненьні.

Пасяўная плошча ў 1914 годзе складала 109 міл. дзесяцін, у 1922 г.—75 міл. дзесяцін, а ў 1927 годзе мы дасягілі амаль даваенных разьмераў пасяўной плошчы і 101 проц. па жывёлаводзтву.

Удзельная вага тэхнічных інтэнсыўных культур складае 130 проц. даваеннага. Па меры ўзмацненьня сельскае гаспадаркі павялічваецца і разьмер капітальных улажэньняў у яе. У 26-27 годзе гэтыя ўлажэньні складаліся з розных крыніц: за лік бюджэту, за лік сельска-гаспадарчага крэдыту, усяго 418 міл. р., а ў наступным 1927-28 годзе вызначана затраціць на капітальнае будаўніцтва сельскае гаспадаркі 520 міл. руб. Зразумела, гэта мала, асабліва ў параўнаньні з тымі лічбамі капітальных затрат, якія мы выдавалі на прамысловае будаўніцтва, але першы буйны крок ужо зроблен і, бязумоўна, у далейшым з разьвіцьцём сельскае гаспадаркі, з падняцьцем яе культуры, з падняцьцем культуры ўсёй краіны, з павышэньнем удзельнай вагі тэхнічных інтэнсыўных культур мы дабіемся значна большых асігнаваньняў на капітальнае будаўніцтва ў сельскай гаспадарцы.

Дасягненьні па каапэрацыі.

Роля каапэрацыі ўсім добра вядома. Вядома, якую сур'ёзную ўвагу зьвяртаў Уладзімір Ільліч на разьвіцьцё каапэрацыі наогул і сельска-гаспадарчай у прыватнасьці.

Сець пізавых каапэратываў на 1-X—26 году па Саюзу складала 66839 з 7369000 сябрамі ў іх. Сельска-гаспадарчая каапэрацыя ўжо год таму назад ахапіла амаль 113 усіх сялянскіх гаспадарак, а зараз лік сяброў сельска-гаспадарчай каапэрацыі будзе ня менш 8000000. На 1-VI—26 г. сельска-гаспадарчай каапэрацыяй выдадзена пазык сялянскім гаспадаркам на 1.9023 тыс. рублёў. У 1926 г. было прададзена сялянству сельска-гаспадарчых машын на суму 90,3 міл. рублёў, з якіх на долю каапэрацыі падае 56,1 міл. руб.

Дасягненьні гандлёвага апарату.

Гандлёва пасрэдніцкія абароты дзяржавы і каапэрацыі ў 1923-24 годзе складалі ўсяго 59,2 проц., гэта значыць, што 40,8 проц. падала на прыватнага пасрэдніка. У 1926-27 годзе гандлёва-пасрэдніцкі абарот дзяржавы і каапэрацыі складае ўжо 78,5 пр., на прыватніка падае ўжо ўсяго—21,5 проц. Як відаць, на працягу 3-х год мы маем вялікае дасягненьне і што мы ідзём па лініі ўзросту ўдзелу дзяржавы і каапэрацыі ў выконваньні гандлёва-пасрэдніцкіх функцый і рэзкага зьніжэньня долі прыватнага пасрэдніка.

Апошняе зьніжэньне цэн па тавары, якое было праведзена па дырэктыве ўраду, дае спажыўцам эканомію па падліках Наркамгандлю ў разьмеры 350 міл. рублёў.

Вы ведаеце, якое вялізнае значэньне для краіны, якой прыходзіцца карыстацца імпортам, мае актыўны балянс (г. з. значнае перавышэньне экспорту над імпортам). 1926-27 год—гэта першы год, які дае нам актыўны балянс у разьмеры 100 міл. р.

Матар'яльнае і культурнае становішча.

Гаспадарчы рост нашай краіны спрыяе падняцьцю матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочых і сялянскіх мас.

Вось лічбы аб сярэдняй заробчай плаце рабочых ў таварных рублёх. У 1921-22 годзе заробчая плата складала—8,84 руб., далей па гадох: у у 1922-23 годзе—13,54; 1923-24—18,48; 1924-25—22,54; 1925-26—25,44 і ўрэшце 28,82 у 1927-28 г.

Таксама важным зьяўляецца пытаньне выхаваньня маладога пакаленьня і пытаньне поўнай ліквідацыі няпісьменнасьці ў нашай краіне. Калі ў даваенныя часы абучалася каля 50 проц. усяго дзіцячага насельніцтва, дык зараз, ня гледзячы на незначнасьць нашых сродкаў, мы ўжо ахапілі 4-хгадовым навучаньнем каля 70 проц. усяго дзіцячага насельніцтва. А ўсеагульнае абавязковае навучаньне будзе закончана да 1932-33 г.г.

Яшчэ лічба аб хатах-чытальнях, якія абслугоўваюць патрэбы сялянскага насельніцтва. На 1 студзеня 1923 году было ўсяго 5.000 хат-чытальень, а ў 1926-27 годзе—24.536. Лічбы гэтыя кажуць, што асьвета пранікае ня толькі ў рабочыя кварталы, але і сельскае насельніцтва.

Рост прамысловасьці і сельскай гаспадаркі.

Нас абвінавачваюць у тым, што рост сельскае гаспадаркі значна абганяе рост прамысловасьці. Гэта кажуць апазіцыянэры дзеля таго, каб паказаць на няправільнасьць нашай палітыкі ў горадзе і ў вёсцы. Прагледзім лічбы за апошнія 3 гады. У той час, калі асноўны фонд прамысловасьці павялічыўся на 28 проц., асноўны фонд сельскай гаспадаркі ўзрос усяго на 10 проц. Гэтыя лічбы даюць адказ, што ЦК цалкам і поўнасьцю выканаў заданьні, пастаўленыя перад ім у галіне эканамічнага будаўніцтва, заданьні, якія былі пастаўлены XIУ зьездам нашай партыі.

Асноўныя цяжкасьці, якія стаяць зараз перад намі, гэта пытаньні рэгуляваньня ўзаемаадносін паміж горадам і вёскай. Існуючая дыспрапорцыя паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркай яшчэ маецца. Пытаньне ліквідацыі дыспрапорцыі, пытаньне ўзмацненьня паглыбленьня ўзаемаадносін паміж горадам і вёскай, пытаньне ўнясеньня плянавасьці ў сельскую гаспадарку, пытаньне ўзмацненьня кіраўніцтва пралетарыяту над сялянствам зьяўляюцца асноўнымі і павінны былі быць практычна ажыцьцёўлены і ўлічаны пры складаньні нашай 5-цігодкі.

Для таго, каб дабіцца фактычнай ліквідацыі дыспрапорцыі, якая існуе паміж прамысловасьцю і сельскай гаспадаркаю, неабходна ісьці і далей па шляху зніжэньня цэн.

Ці правільнай была наша палітыка.

Яшчэ напярэдадні XIУ зьезду мы мелі ў вёсцы астаткі ваеннага камунізму, ня былі яшчэ створаны абставіны, якія-б не перашкаджалі разгарнуць сельскую гаспадарку. У весны былі хістаньні. Гэтыя хістаньні выліліся ў паўстаньне ў Грузіі. Настроі некаторага нездавальненьня ў вёсцы мы спачасова улічылі, і на XIУ зьезде партыі было прынята рашэньне, згодна якога, з аднаго боку, неабходна было даць больш ініцыятывы і неабходна стварыць умовы, якія-б палегчалі разьвіцьцё сельскае гаспадаркі. З другога боку, мы таксама ведаем, што ад гэтага ў значнай меры выйграе і кулак. Але, ведаючы, якая зьвязана з гэтым небясьпека і ўводзячы правільную лінію, мы дасягілі тых вынікаў, якія зараз маем. Значыцца, улічваючы карысьць, якую мы будзем мець, і, ня гледзячы на тое, што ад гэтага можа ўзмацніцца таксама ў значнай меры і кулак, мы ішлі на гэтай лініі. Сёньня мы можам сказаць, што дабіліся буйнага пералому, які выяўляецца ў тым, што серадняк больш зблізіўся з бедняком, што, кулак ізаляваны, што палепшылася матар'яльнае становішча серадняка, што, праўда, узмацніўся і кулак, але ў процантных адносінах нарастаньне серадняцкіх элемэнтаў ідзе значна хутчэй, чым кулацкіх.

У сучасны момант мы можам да гэтага пытаньня падыйсьці інакш, чым два гады таму назад.

Два гады таму назад апазіцыя гаварыла: націскай на вёску, бяры больш падаткаў ад кулака, ня ўлічваючы, што тым самым мы будзем разбурваць гаспадарку серадняка, гэта значыць, не даваць разьвівацца сельскай гаспадарцы, гэта значыць, згуртаваць кулака з серадняком і дабіцца адваротных вынікаў. Сёньня кулак ізаляван. Зьбліжэньне паміж серадняком і бедняком—бязумоўны факт, зьбліжэньне паміж горадам і вёскай таксама факт. І сёньня мы ўжо можам пайсьці далей. Апошні пленум ЦК і ЦКК гэта зрабіў. Мы зараз можам узмацніць нажым на кулака, бо цяпер серадняк і бядняк у вёсцы пойдуць разам з намі супроць кулака і, такім чынам, можна будзе зжыць тыя капіталістычныя элемэнты, якія маюцца ў вёсцы, паступова ўзмацняць у далейшым сацыялістычны сэктар.



Тав. Уншліхт.

Пастановы нашага XIУ зьезду адыгралі гістарычнае значэньне, яны фактычна замацавалі саюз гораду з вёскай, яны фактычна ізалявалі кулацкія элемэнты, яны сёньня далі фактычную рэальную магчымасьць павесьці барацьбу з кулаком, і ў гэтай барацьбе мы пераможам, маючы надзейны саюз серадняка з бедняком.

Ці ўнесла Кастрычнікавая рэвалюцыя зьмены ў эканоміку вёскі.

Нам у адказ на гэтую палітыку, на гэтыя дасягненьні апазіцыя ставіць пытаньне такім чынам, быццам-бы наша памылка ў тым, што ў нас усё прынцыпова інакш, чым пры капіталізьме (Сьмілга).

Калі хто не зразумеў сутнасьці Кастрычнікавай рэвалюцыі, калі хто не зразумеў ролі і значэньня нацыяналізацыі зямлі, нацыяналізацыі вытворчасьці, транспарту, крэдытаў, банкаў, калі хто не зразумеў значэньня манаполіі замежнага гандлю, калі хто лічыць, што пры такім становішчы, пры такіх здарэньнях сусьветнага значэньня працэс разьвіцьця вёскі ідзе па аднаму і таму-ж шляху, што і пры капіталістычнай уладзе, той зусім нічога не зразумее.

Мне здаецца, што тут пытаньне зусім зразумела, яно не патрабуе каментарыяў. Наш шлях—гэта шлях узмацненьня сацыялістычнага сэктару ў вёсцы, і тая палітыка, якую мы ажыцьцяўляем, роля і рост каапэрацыі, гэта ёсьць гарантыя, што курс на рашучую барацьбу з кулаком, які цяпер узяты намі правільны, гэта ёсьць гарантыя таго, што капіталістычныя элемэнты ў вёсцы бу уць усё памяншацца, у той-жа час, калі сацыялістычныя элемэнты будуць усё больш узмацняцца. Наша палітыка ў вёсцы зараз дае такія вынікі, якія новая эканамічная палітыка ў горадзе дала ў адносінах да прыватніка.

Такім чынам, на пытаньне, якое наша ўнутранае становішча, якое ўнутранае эканамічнае жыцьцё краіны, можна адказаць—**ідзём уперад, ёсьць яшчэ шмат недахопаў, шурпатасьці, але асноўная лінія правільна і практычных вынікаў шмат.**

Мы можам сказаць, што XIУ зьезд партыі прыняў пастанову, якое намі поўнасьцю ажыцьцяўляецца, якое стварыла пералом у настроях серадняцкіх элемэнтаў у адносінах да савецкае ўлады. Калі раней скаргі ад сялян насілі масавы характар, дык зараз бываюць адзіночныя выпадкі. Мы можам сказаць, што ЦК з пастаўленымі задачамі справіўся. І, ня гледзячы на абвінавачваньне апазіцыі—мы ленінцы, мы цалкам і поўнасьцю ажыцьцяўляем вучэньне Леніна і маем шмат практычных вынікаў.

Абарона краіны.

Тое, што мы можам паставіць перад сабой праблему 5-цігодкі, кажа аб тым, што наш гаспадарчы апарат узмацніўся, што мы спраўляемся з нашымі задачамі.

Мы можам са здавальненьнем адзначыць, што па дырэктывах пленуму ЦК і ЦКК у кантрольныя лічбы 5-цігодкі ўвашлі выдаткі на абарону нашага Саюзу. Гэтае рашэньне мае вялізнае значэньне. Нам трэба будаваць нашу прамысловасьць так, каб, калі патрабуецца, можна было хутка прыстасаваць асобныя фабрыкі і заводы для патрэб абароны.

І калі вайна прыдзе, дык у частцы, якая датычыцца будаўніцтва і дасягненьняў у галіне будаўніцтва ўзброеных сіл, мы знаходзіліся ў такім становішчы, пры якім з ворагам можна змагацца, і я ўпэўнен, што пераможам у гэтай барацьбе мы, што савецкая ўлада зможа вытрымаць усе цяжкасьці, зьвязаныя з магчымай новай узброенай барацьбой з намі клясавага ворага.

Чырвоная армія.

У будаўніцтве ўзброеных сіл рэвалюцыі мы ішлі па шляху, паказанаму Ўладзімірам Ільлічом Леніным.

Цяпер на парозе другога 10-цігодзьдзя і ў сувязі з XУ зьездам, ЦК нашай партыі прыдзецца даць справаздачу ўсёй краіне аб становішчы арміі.

Палітыка-маральнае становішча арміі зьяўляецца ўпаўне здавальняючым. У асноўных сучасных пытаньнях міжнароднага становішча чырвонаармейцы і камандны склад паказалі правільную арыентыроўку, якая забясьпечвае правільныя адносіны да задачы павышэньня абароназдольнасьці краіны.

Апошнія манэўры паказалі, што Чырвоная армія зрабіла значныя посьпехі ў сваёй палітычнай і баявой падрыхтоўцы.

Нашы чырвонаармейцы і камандны склад аказаліся цалкам на высаце патрабаваньняў, якія вымагаюцца сучасным боем. Ёсьць асобныя недахопы, але мы дабіліся значных посьпехаў на шляху іх зьнішчэньня.

Матар'яльна - бытавое становішча Чырвонай арміі бязупынна паляпшаецца. Наш вайсковы бюджэт расьце, але яго процант у агульна-дзяржаўным бюджэце падае.

У 1924-25 годзе выдаткі займалі 14 проц. у агульна дзяржаўным бюджэце, у 1925-26 годзе—14,2 проц., а ў 1926-27 годзе—12,7 проц.

У харчаваньні маецца значнае палепшаньне. Калі ў 1924-25 годзе мы мелі 3.099 калорый, дык у 1926 годзе мы мелі ўжо 3,242 кал. У гэтым годзе колькасьць калорый будзе яшчэ больш павялічана. Яна, прыблізна, дойдзе да 3.329. Таксама мы маем палепшэньне і ў адносінах абмундзіраваньня.

Вырасла ў вялікай меры заробчая плата камандзнага складу. Гэта вялізнае дасягненьне, якое ставіць у шмат лепшыя ўмовы наш камандны склад у параўнаньні з тым становішчам, у якім ён знаходзіўся яшчэ 2-3 гады таму назад.

Кожны год колькасьць грошай, адпускаемых на казарменнае будаўніцтва, павялічваецца.

Твар Чырвонай арміі.

На працягу 1920-27 г.г. колькасьць партыйцаў-камандзіраў значна вырасла. Калі ў 1920 годзе партыйцаў-камандзіраў было—10,5 проц., дык на 1-га студзеня 1927 году іх ужо было—54 проц.

Па ўсяму складу Чырвонай арміі ў нас на 1-е студзеня 1927 году ёсьць: партыйцаў—4,7 проц.; камсамольцаў 15,2 проц. і беспартыйных—80,1 пр.

Сацыяльны склад Чырвонай арміі дае наступны малюнак: у 1925 годзе рабочых было 17,7 проц., сялян—71,3 пр. і іншых—11 проц.

У 1926 г.: рабочых ужо 18,1 пр., сялян 71,3 і іншых 10,6 проц. Такім чынам, за кошт павялічэньня процанту рабочых памяншаецца процант іншых.

Тэрытарыяльная сыстэма.

За некалькі год свайго існаваньня тэрытарыяльная сыстэма практычна поўнасьцю апраўдала сябе. Мы маем да 10-й гадавіны Кастрычніка моцныя тэрытарыяльныя часьці. Мы выхавалі за гэты пэрыяд новыя кадры камскладу, якія спраўляюцца з складанымі ўмовамі працы ў тэрчасьцях. Тэрэборы працякаюць у абставінах таварыскай і напружанай работы. Па сваёй падрыхтоўцы тэрчасьці стаяць ня ніжэй кадравых.

Тэрытарыяльная сыстэма набывае з кожным годам усё больш папулярнасьці сярод шырокіх сялянскіх мас. Аб гэтым сьведчыць 100 проц. яўка тэрармейцаў на зборы.

Марскі і паветраны флёт.

Марскі флёт у нас адбудован і стаіць добра на варце савецкіх берагоў. У гэтым годзе адэскія манэўры і частковa манэўры Ленінградзкай акругі праходзілі пры ўдзеле нашага флёту. Удзел у манэўрах нашага флёту паказаў, што флёт стаіць на належнай вышыні.

У галіне паветранага флёту мы прымаем усе меры, каб даць магчымасьць яму больш разгарнуцца так, каб можна было канкураваць з арміямі капіталістычных краін. Посьпехі маюцца ня толькі таму, што флёт павінен адыграць у будучай вайне вялізную ролю, асабліва ў злучэньні з хімічнымі сродкамі барацьбы, але і таму, што ў нас на авіяпрамысловасьць зварочваецца зараз сур'ёзная ўвага. Калі ў мінулым годзе нам прыходзілася выпісваць маторы з замяжы, дык зараз мы можам сказаць, што з пабудовай самалётаў мы можам самі справіцца.

Такім чынам, на 11 годзе існаваньня савецкае ўлады мы ўжо можам будаваць самалёты сваімі ўласнымі сіламі, маторы нашы па сваёй якасьці ня горш замежных. Прыкладам можа служыць пералёт нашага лётчыка Шэстакова з Масквы ў Токіё. Вы ведаеце, што самалёт нашай вытворчасьці працаваў безперапынна 153 гадзіны, у той час, як такога-ж тыпу самалёты за мяжой могуць даць ня больш 60 гадзін. Другім прыкладам нашых вялікіх дасягненьняў у гэтай галіне зьяўляюцца манэўры, арганізаваныя да 10 гадавіны Чырвонай арміі. Мы жадалі дэманстраваць на Чырвонай плошчы палёт самалёта і мы далі распараджэньне, каб з усіх акруг накіраваць у Маскву 300 самалётаў. Ня гледзячы на вельмі цяжкія мэтэорологічныя ўмовы, толькі нязначны процант пацярпеў аварыі. Самалётамі была пакрыта адлегласьць у 149 тыс. 150 кілёмэтраў. Вось якія вялікія дасягненьні мы маем у галіне паветранага флёту. Мы ідзём па шляху далейшага яго ўзмацненьня і разьвіцьця. Мы становімся незалежнымі, самастойнымі і нязьвязанымі ў гэтых адносінах з замежнымі краінамі.

Кажучы аб авіяцыі, нельга не сказаць аб хіміі. Тым больш, што авіяцыя і хімія самым цясьнейшым чынам зьвязаны між сабой. Мы толькі апошнія 4 гады шчыльна падыйшлі да пытаньняў хімічнае абароны, і трэба сказаць, што за такі нязначны час мы дасягілі самых буйнейшых вынікаў і ў галіне процівагазаў і ў галіне хімічных атручваючых матэрый.

У справе хімічнае абароны актыўны ўдзел прынае наша грамадзкая арганізацыя «ОСО-Авіяхім», на сродкі якой будуецца ў Маскве Інстытут процігазавай абароны.

У нас ужо ёсьць частка спэцыялістых, якіх удалося ўцягнуць у грамадзкую працу, якія сталі разам з намі працаваць, не пакладаючы рук. З другога боку, мы можам пахваліцца, што ўжо маюцца ў нас кадры маладых вучоных з рабочых і сялян—тэхнікаў і спэцыялістых.

Спробы апазіцыі пралезьці ў армію.

Можна напэўна сказаць, што за справаздачны пэрыяд маем ўзмацненьне камуністычнага ядра. Былі спробы з боку апазіцыі пралезьці ў нашы шэрагі, але з гэтага нічога ня вышла, і наш асноўны партыйны асяродак і камсамольскія арганізацыі не паддаліся разлагаючаму ўплыву апазіцыі.

Апазіцыя ў арміі ня мае ніякага ўплыву.

Нашы задачы.

У далейшым нам неабходна яшчэ больш удасканаліць баявую падрыхтоўку нашай Чырвонай арміі, навучыць войска ўсёй тэхніцы сучаснага бою.

Нам трэба яшчэ больш падняць узровень ведаў камандзнага, палітычнага і адміністрацыйнага складу РСЧА; неабходна выхаваць вопытнага ў кіраўніцтве войскамі камандзіра Чырвонай арміі.

Нам

Камсамольскі актыў Менску за лінію ЦК.

Заля клюбу Карла Маркса хутка напаўнеецца. Не ўпяршыню зьбіраецца ў ёй Менскі гарадзкі камсамольскі актыў.

Сёньня даклад тав. Васілевіча аб XV партзьезьдзе і задачах камсамолу!

Асобнай групкай можна ўбачыць і камсамольскіх апазіцыянэраў. Яны, відаць, прыхтаваліся да гэтага сходу.

Уся сямёрка «прышла ў поўным узброеньні».

Першым з іх гаварыў тав. Нахамкін.

Нахамкіна актыў ужо ведае па яго раней выступленьнях. Сёньня ён выступае зноў, але ўжо «накачаны», праінструкаваны лідэрамі апазіцыі ў Маскве, куды Нахамкін ездзіў у 10-ю гадавіну Кастрычніку рэвалюцыі.

Акрамя паўтарэньня старых абвінавачаньняў пра перараджэньне, бюракратызм, пра «прыжыманьне» ў партыі, Нахамкін услед за Троцкім дакаціўся да новай лаяны.

Ён заявіў, што ў рамках партыі нельга будзе вырашыць разнагалосьсі, а вырашыць іх рабочая клясa, вузіца.

Абраны сход ня даў больш гаварыць Нахамкіну.

Цішыня ў залі паступова перайшла ў гоўдзіс і крыкі.

— Далоў яго... Хопіць!..

Другі апазіцыянэр, які спрабаваў шчасьця, быў Канеўскі, які пачаў сваю прамову тым, што зраўняў сход актыву з ППС (партыя польскіх меншавікоў).

Сход адмовіўся яго слухаць і патрабаваў аб Канеўскага пазбавіці слова, пакуль ён не папросіць прабачэньня. Канеўскаму прыйшлося пад агульны сьмех прысутных прасіць прабачэньня.

Пагаварыўшы некалькі хвілін, яму прыйшлося разьвітацца з трыбунай.

Трэці апазіцыянэр Савіцкі абвясьціў Троцкага і Зіноўева праваднярамі сусьветнай рэвалюцыі, за што пад канцэрт сьвістоў уцёк з трыбуны.

Астатнія апазіцыянэры не адважыліся больш выступаць.

* * *

На сход былі запрошаны т. т. Уншліхт Кнорын, Ланда (Нач. ПУОКР ВВА), якія горача былі спатканы сходам, пад крыкі Ура... „Няхай жыве Ленінскі ЦК" «Нахай жыве наша старая гвардыя».

Тав. Кнорын паведаміў, што Канеўскі езьдзіў у Сьвярдлоўск і інш. гарады з шыфраванымі дакумантамі, дзе трымаў сувязь з надпольнымі групамі, што па загаду Вуйсёвіча ён дзейнічаў у Менску.

Сход спаткаў гэтае паведамленьне крыкамі: „Вон яго з камсамолу", „Пазор".

Падрабязна спыніліся на характары апошніх выступленьняў апазіцыі т. т. Уншліхт і Ланда.

Тав. Уншліхт сказаў, што прадыроў апазіцыі Троцкага і Зіноўева неабходна яшчэ да зьезду выключыць з партыі.

Тав. Баранькінаў у сваёй прамове спыніўся на значэньні ўдзелу камсамолу ў дыскусіі.

— Апазіцыянэры,—кажа тав. Баранькінаў,—скардзяцца, што няма ў нас саюзнай дэмакратыі. А хіба сёньня Нахамкін, Савіцкі і Канеўскі „змыліся" з трыбуны не па жаданьню 600 прысутных, крыкі якіх прымусілі іх заставіць трыбуну. Ды гэта-ж вышэйшая форма дэмакратыі.

Прынятая актывам рэзалюцыя патрабавала выключэньня апазіцыянэраў з партыі. Сход прапанаваў Менскаму АК ЛКСМБ зараз выключыць з пэрагаў КСМ усіх апазіцыянэраў.

* * *

Даўно ня дрыжэлі так сьцены клюбу Карла Маркса. Менскі актыў пакамсамольскі спаткаў старэйшых таварышоў т. т. Уншліхта і Кнорына.

Гэтае спатканьне было сымбалем далучэньня Менскага актыву камсамола да рашэньняў ленінскага ЦК.

Р. Г-н.

Сьвята замірэньня.

(З успамінаў).

11-га лістапада 1918 году застанецца назўсёды памятнаю датаю як для жыхарства гораду Парыжу, так і для ўсіх іншых людзей.

Замірэньне! Канец бяссэнсная для працоўных народаў вайне, канец чатырохгадовай пакуце, крывавым бойкам, якія забіваюць кожны дзень у магілу сотні і тысячы маладых ахвяр.

Нямецкае войска адступае на ўсім фронце, а там, далёка ў тыле, бурапенящца хвалі справядлівага народнага гневу, зьнімаецца рэвалюцыйная навальніца. Адна за адною скідаюцца кароны з галоў начыніваў-каралёў і манархаў, якія забылі сваім вар'яцкім засьляненьні, што народ — ня статак пявольнікаў, і што можа, нарэшце, надыйсьці хвіліна, калі і гэтыя, давалася-б пакорныя рабочыя і салдаты, кажуць сваё важкае слова. Вільгельм, каюцячыся за свой лёс, ужо дагадаўся пачэпць сваю агорнутую рэвалюцыяй бацьвучыну і трусьліва схаваўся за мірнымі гасьцінымі сьценкамі галяндзкага палацу. Вораг пераможан, ён просіць міру, ён хаваецца ужо сам пра канец крывавай бразабойнай вайны. І мір яму дадзен. Праўда, мір глыбока клясавы, дзе патрэбы і правы працоўных г. зн. тых, хто на сваім арку вытрымаў у весь цяжар гэтай крывавай бойні, забыты і далёка ня вырашаны, дзе ўсё надыхае ўзаемнаю нянавісьцю, дзе далей кожны радок так званага „мірнага" тавору зьяўляецца прычынаю для нездаволеньня і да новай, мо' яшчэ больш крывавай, вайны.

Але ўсё-ж такі мір, доўгачаканы жаданы мір! І ўзрадаваны Парыж, а за ім і ўся Францыя, Англія, Італія, усё чалавецтва з адкрытым радасным сэрцам кінуліся віталь гэтага даўночаканага госьця.

Грымяць гарматы, на гэты раз апавяшчаючы не пра сьмерць, а пра радасьць, весьць; на вуліцах, сядох, завулках з сіх бакоў ідуць узрушаныя манэфестацыі. Няхай жыве Францыя! Няхай жыве спакой!—узьнімаюцца да яснага асьненьняга неба вясёлыя выгукі, узьвіваюцца сьцягі і штандары, грае музыка, а паважныя гукі гарэзьлівы, расплываючыся над усім, пануюць над Парыжам. Усе ўзрадаваны, усе даволены ў гэты вялікі гістарычны дзень замірэньня: і багаты буржуа, і бедны рабочы, і зашмальцаваны, прапахлы дымам порху салдат.

Але ёсьць адно пакутнае чалавечае сэрца ў Парыжы, якое моцна сьціскаецца ў гэты вялікі ўрачысты дзень усеагульнае радасьці і здаволеньня. Гэта сэрца расейца. Яно хварэе за сваю забытую ворагамі саюзьнікамі радзіму, за дарэмныя мілёны забітых і пакалечаных, за зруйнаваныя гарады і вёскі роднага краю.

А сьвяткаваньне разгараецца ўсё больш і больш, захлынаючы сваёй буйнай радасьцю ўсе самыя далёкія куточкі Парыжу.

Узьвіваліся ракеты, асьвятляючы сваім бляскам цемень асеньняе ночы; шматлікія кафэ да позьняга часу былі перапоўнены скокамі, а на шырокіх бульварах ад пляцу Мадлен да далёкага Манмарту панавала вакханалія Нязьлічаныя гурмы жвавага і радаснага народу шпацыравалі туды і сюды, віталі пры спатканьні салдат і афіцэраў, засыпалі адзін аднаго квяцістымі паперачкамі, цалаваліся, перакідваліся вясёлымі стромкім слаўцом. І спыняючыся з сірочаю доляю на вуліцах вясёлага гораду, я мімаволі думаў пра тыя мілёны жанок, мацерак і бацькоў, якія, аддаўшы лютаму богу вайны самае каштоўнае, што яны мелі, плачуць сёньня горкімі сьлязьмі над сваімі загінуўшымі нябожчыкамі.

І чаму ён не пачакаў яшчэ два месяцы, навошта паспаў на навізію?!—чуецца мне скрозь вясёлыя сьпевы поўны пакуты стогн маладой прыгожай пакаёўкі, якая галосіць на сваім забітым на фронце браце,—ён не ляжаў-бы цяпер у сырой зямельцы, ён сьвяткаваў-бы разам з усімі перамогу і вызваленьне».

А колькі гэткіх, выкрэсьленых з сьпісу жывых, маладых і здаровых людзей загінула нікчэмна за гэтыя 4 гады страшэннай братазабойнай вайны. І ня толькі за два месяцы, але мо' нават учора і сёньня, за некалькі хвілін да замірэньня суровая сьмерць забрала яшчэ некалькі ахвяр, пакінула яшчэ некалькі асірацелых мацерак і жанок. Вось чаму гэта вялікае радаснае сьвята так непарыўна зьвязана са сьлязьмі і стогнамі, вось чаму да пераможнай конаўкі ажыўляючай вады будуць прымешаны горкія сьлёзы жалю, пакуты.

А між тым, шалёны струмень народнай радасьці ўсё мыркуся, заліваючы ўсе самыя далёкія, самыя глухія, самыя забітыя куткі Парыжу і ваколіц. І яшчэ доўга, да самага вогаку, чуліся сьпевы ў паветры нарушаючы цішыню цёмнай асеньняй ночы.

Мінулі гады. Як картачная хаткі ад дзьмуху—вынікаюць усе мары, усе эгаістычныя ўгаворы пераможных нацый. Пахаваны, забыты, ці новы рэвалюцыйны і сапраўды вольны край саветаў, які адсьвяткаваў ужо 10-ыя ўгодкі свайго ўзраджэньня, з пагардна ўзьнятаю галавою ўжо даўно ўзышоў ізноў на арэну інтэрнацыянальнага грамадзкага жыцьця.

11-га лістапада 1918 г. і 7-га лістапада 1917 г.—дзьве даты, якія мяжуюць канец старога, і з руін гэтага старога народжаны пачатак новага сьвету.

Вялікі Кастрычнік—гэта першы магутны покліч прачнулага народу, стварэньне іншага сацыяльнага жыцьця, новае напаўненьне працы і братэрства народаў усяго сьвету.

Н. Бяліна-Падгаецкі.

Узмацняем пралетарскі авангард—лепшыя рабочыя ўступаюць у партыю.

БАРЫСАЎСКІ РАЙЁН.

Пададзена 107 заяў аб паступленьні ў партыю з наступных прадпрыемстваў: зав. «Домбаль»—30 заяў, чыгунка—21, зав. «Камінтэрн»—15, зав. Р. Люксэмбург»—14, зав. «Рабочы»—11, ф-ка «Бярэзіна»—10, рэшта з іншых заводаў.

ГАРАДЗКІ РАЙЁН.

(Менск).

Пададзена заяў 23, з іх: з 2-й друкарні—7, з Торгстрою—3, Белгосстрой—3, зав. «Дзеравааапрацовачнік» — 2, саюз друкароў—2, Меншвэй—3 і зав. «Беларусь»—3.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Падпіска на пазыку індустрыялізацыі.

ДЫРЭКТЫВА ВЫКАНАНА.

г. Слуцак.

Падпіска на пазыку індустрыялізацыі на Слуцкім райёне праходзіла пасьпяхова, аб чым сьведчаць наступныя лічбы: на 15-X падпіска дала 3000 руб., 22-X—9000 руб., на 5-XI - 16820 руб. і на 11-XI—20305 р.

Неабходна таксама падкрэсьліць зацікаўленасьць з боку рабочых і служачых, якую яны выявілі да пазыкі індустрыялізацыі.

Згодна апошніх даных, у БССР рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 1.871.580 р. Падпіска выканана на 86 проц. заданьня.

У АКРУГАХ.

Па даных на 9 лістапада, у Мазыршчыне рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 97895 руб. У апошнія дні ажывілася афармленьне калектыўных залвак.

Да 11 лістапада ўключна на Аршанскай акрузе рэалізавана пазыкі на 143.935 рублёў.

У Магілеўшчыне рэалізавана пазыкі індустрыялізацыі на 119.260 р.

КУРСЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ Ў ВНУ.

Віцебск, 13-XI. З 10 лістапада распачалі заняткі курсы па падрыхтоўцы ў ВНУ, тэхнікумы і рабфакі. Усяго на курсы залічана 107 слухачоў, з якіх рабочых—52 чал., утрыманцаў рабочых—13 чал., служачых—46 чал. і вайсковаслужачых—6 чал.

ПАШЫРЭНЬНЕ ПЧАЛЯРСТВА.

Ворша 14-XI. Па акрузе налічваецца 2370 пчалярных гаспадарак, якія маюць 6497 сямей пчол, з іх у калодах 3625 і ў рамавых вульлях 2872. (У падлік не ўвайшлі райёны, далучаныя ў гэтым годзе).

Да гэтага часу ў акрузе арганізаваны 3 каапэрацыйныя пчалярныя т-вы: Аршанскае, Горацкае і Лядзянскае, у якіх на 1 кастрычніка г. г. налічваецца 206 членаў; сямей пчол—2860, з якіх у рамавых вульлях 1460 і ў калодах каля 900.

Апрача гэтага, у Воршы пры с.-г. музэі Акрэа ў гэтым годзе арганізавана вучэбна паказальную пчэльню. Па гэтай пчэльні, дзе маецца 13 сямей пчол, сёлета праведзены 2-хтыднёвыя курсы па пчалярству.

МАШЫНЫ ВЁСЦЫ.

Віцебск, 14-XI. У гэтым годзе па пляну акрэмаддзелу павінна быць дастаўлена ў акругу сел.-гас. машын і прыладаў на 1500000 р.

ПАДАРУНАК КАСТРЫЧНІКУ.

Полацак. Гарадзкая камсамольская арганізацыя ў выніку правядзеньня «суботніка» зарабіла больш 500 р. Грошы пераведены ў цэнтральную кастрычнікавую камісію ў фонд барацьбы з бяспрытульнасьцю.

РАЗЬМЕРКАВАНЬНЕ КРЭДЫТУ.

Гомель, 14-XI. Праўленьне с.-г. банку разьмеркавала паміж крадытнымі т-вамі акругі ў лік крэдытаў 1-га кварталу 15.000 руб. на перасяленьне па землябудаўніцтву і 25.000 руб. на пакупку рабочай жывёлы.

УДЗЕЛ СПАЖЫВ. КААПЭРАЦЫІ Ў ЗАГАТОЎКАХ.

Барысаў, 14-XI. Калі раней спажывецкая каапэрацыя загатоўкі сыравіны зусім не вяла, дык толькі за апошнія 4 м-цы гэтага году пізавая сетка спажыв. каапэрацыі загатовіла рознай сыравіны на досыць буйную суму ў 62234 р.

ДАРОЖНАЕ БУДАЎНІЦТВА.

Ворша, 14-XI. Па акрузе за мінулы год пабудован па шляхох мясцовага значэньня 21 мост, агульным працягам у 435,8 мэтра.

СТАНОВІШЧА АЗІМЫХ ПАСЕВАЎ.

Гомель, 14-XI. На вестках экспэртнай камісіі пры акр. статбюро, становішча азімых усходаў здавальняючае. Жыта ацэньваецца ў 3,2 бала, пшаніца—3,1 бала.

ПРАВЫСІМ ДАВАЕННУЮ НОРМУ НА 54,8 ПРОЦ.

Барысаў, 14-XI. Заканчваецца праца па пераабсталяваньню драждзжавога заводу імя Леніна. Пасьля перабудаваньня завод будзе выпускаць з пуда сухіх прыпасаў 20 фунтаў дражджэй замест 16, што выпускаліся дагэтуль. У дарэвалюцыйны час завод выпускаў з пуда прыпасаў усяго толькі 13 фунтаў. Такім чынам даваенная норма будзе перавышана на 54,8 проц.

ЗЕМЛЯЎПАРАДКАВАНЬНЕ.

Бабруйск, 14-XI. Па 5-цігадовому перспэктыўнаму пляну разьвіцьця народнай гаспадаркі на акрузе прадугледжана землеўпарадкаваць 60028 сялянскіх гаспадарак на плошчы ў 540250 гэктараў.

ХОД ЗАГАТОВАК.

Бабруйск, 14-XI. Хлебазагатоўкі па акрузе праходзяць даволі слаба. Акр. саюз с.-г. каапэрацыі загатовіў 2000 пуд. льнянога семя.

Нізавой сеткай с.-г. каапэрацыі загатоўлены 277 вагонаў бульбы.

Скуры акр. саюз с.-г. каапэрацыі загатовіў: 1200 штук буйных і 500 штук дробнае жывёлы. Сена загатоўлена 75000 пуд. Усяго-ж сена ў гэтым годзе мяркуецца загатовіць 200000 п

Да пытаньня аб спрашчэньні земляўпарадкаўчага працэсу.

Мэтай гэтага артыкулу зьяўляецца жаданьне абгаварыць на старонках друку некаторыя палажэньні па пытаньню аб спрашчэньні земляўпарадкаўчага працэсу, высунутым таварышам КП у артыкуле **«Новы праэкт спрашчэньня земляўпарадкаўчага працэсу»**, зьмешчаным у 246 нумары «Савецкай Беларусі» ад 28 кастрычніка 1927 году.

Спачатку неабходна адзначыць, што, пытаньне аб спрашчэньні земляўпарадкаўчага працэсу ўжо даўно займаў увагу зямельных работнікаў. Існуючы парадак разгляду земляўпарадкаўчых спраў настолькі грамоздкі і складаны што калі ён і быў неабходны раней, калі зямельны апарат быў слаб, то і ў сучасны момант ён не апраўдваецца неабходнасьцю і зьяўляецца няжыцьцёвым.

Гэта акалічнасьць прымусіла Аддзел Земляўпарадкаваньня НКЗ паставіць у парадак дню пытаньне аб спрашчэньні земляўпарадкаўчага працэсу. Дзеля гэтай мэты быў абвешчан спэцыяльны конкурс на прадстаўленьне лепшага праэкту спрашчэньня і, апрача гэтага, была праведзена вялікая падрыхтоўчая праца спэцыялістамі НКЗ,—вынікам гэтае калектыўнае працы і зьявіўся праэкт спрашчэньня працэсу, які паслалі на абгавораньне ў акруговыя зямельныя аддзелы.

Сутнасьць гэтага праэкту—аб'яднаньне дзьвюх паасобных стадый працэсу—падрыхтоўкі і выкананьня ў адну стадыю і разгляд земляўпарадкаўчых спраў у зямельных камісіях: адзін раз у райённай і ў спрэчных выпадках яшчэ адзін раз у акруговай, замест разгляду тры разы ў райённай і тры разы ў акруговай, як гэта робіцца зараз.

Галоўным недахопам вышэйпамянёнага праэкту, па думцы КП, зьяўляецца тое, што ён не закранае пытаньня аб аб'яднаньні дзьвюх устаноў, якія займаюцца кіраўніцтвам земляўпарадкаваньня: зямельных камісій і земляўпарадкаўчых устаноў.

Па маёй думцы, гэта прапанова зьяўляецца няправільнай і ніякага афэкту ў сэнсе спрашчэньня земляўпарадкаўчага працэсу аб'яднаньня гэтых устаноў ня дасьць. Папершае, памылка КП крыецца ў тым, што ён адносіць зямельныя камісіі да ўстаноў, кіруючых земляўпадкаваньнем. Гэта далёка ня так. Зямельныя камісіі зьяўляюцца судовымі ўстановамі, якія павінны разглядаць усялякія спрэчныя зямельныя справы, у тым ліку і земляўпарадкаўчыя, а апошнія складаюць толькі 1/5 спрэчных зямельных спраў, разглядаемых у зямельных камісіях.

Калі-ж аб'яднаць зямельныя камісіі з земляўпарадкаўчымі ўстановамі і ўскласьці на гэты аб'яднаны орган разгляд усіх спрэчных зямельных спраў, дык функцыі гэтага органу будуць надзвычайна ўскладнены, бо з аднаго боку, яго мэтавай установкай будзе кіраваньне земляўпарадкаваньнем, а з другога—рэгуляваньне ўсіх спрэчных зямельных пытаньняў. Гэта акалічнасьць, бязумоўна, дрэнна адаб'ецца на працы і ніякага спрашчэньня працэсу ня дасьць, бо колькасьць разглядаемых спраў ад гэтага не паменшыцца. Спрашчэньня можна дасягнуць толькі памяншэньнем ліку інстанцый, разглядаючых земляўпарадкаўчыя справы, што і высоўваецца праэктам.

Але самым галоўным, што прымушае пярэчыць супроць такога аб'яднаньня, зьяўляецца тое, што пры ім тая-ж самая ўстанова, якая выконвала земляўпарадкаўчую справу (у асобе свайго апэратыўнага пэрсаналу), будзе зьяўляцца і судзьдзёй, разглядаючай і зацьвярджаючай гэту справу, а гэта акалічнасьць бязумоўна пазбавіць гэту ўстанову аб'ектыўнасьці.

КП сам-жа адзначае, што ў райёне, дзе гэта аб'яднаньне фактычна ёсьць, бо там адзін чалавек **«в двух лицах»**—загадчык зямельных спраў і ён-жа старшыня райённай зямельнай камісіі,—зусім усё зьмяшалася, і выходзіць падвойнасьць і блытаніна ў працы.

Што-ж, па думцы КП., трэба гэту блытаніну перанесьці і ў вышэйшыя земляўпарадкаўчыя ўстановы?

Далей КП знаходзіць неабходным пакінуць падрыхтоўку,—як паасобную стадыю працэсу, з вытварэньнем праз высад земляўпарадкавацеля на мейсца для абсьледваньня, і разгляд матар'ялаў гэтага абсьледваньня ў райённай зямельнай камісіі. З гэтым таксама ня можна згадзіцца, бо мэта, якая ставіцца праэктам спрашчэньня, заключаецца ў тым, каб дабіцца бесьперарыўнага выкананьня земляўпарадкаўчых спраў ад пачатку да канца, з тым, каб земляўпарадкавацель ехаў адзін раз у вёску, быў там да канца выкананьня справы і, скончыўшы, перадаваў яе ў зямельную камісію, якая разглядае яе адзін раз. Пагэтаму падрыхтоўка, як паасобная стадыя працэсу, з праэкту спрашчэньня выключаецца. Прапанова К. П. у гэтай часьці ніякага спрашэньня працэсу не дае. Між іншым III-я земляўпарадкаўчая нарада РСФСР таксама стала на такі-ж пункт погляду, лічачы, што рашучым спрашчэньнем працэсу зьяўляецца бесперарыўнасьць выкананьня справы.

Пазямельна-гаспадарчае ўпарадкаваньне зьяўляецца абавязковым этапам земляўпарадкаваньня (праэкт гэтага і не адхіляе) і павінна вытварацца зараз-жа пасьля так званага групавога земляўпарадкаваньня, чым і дасягаецца бесперарыўнасьць выкананьня справы; а ў выключных спрэчных выпадках яно выконваецца пасьля зацьверджаньня групавога праэкту, пры гэтым райземкамісія павінна рабіць пастанову з паказаньнем вестак, якіх вымагае 173 арт. зямельнага кодэксу. Такім чынам, і распачынаць новае землякарыстаньне і выдаваць пасьведчаньні дакуманты неабходна пасьля зацьверджаньня групавога праэкту.

Праца па землянадзяленьню прыроўнена цяпер да працы па ўнутрывясковаму земляўпарадкаваньню і ўсе высунутыя праэктам спрашчэньні датычацца таксама і іх.

Дужа пажадана, каб мясцовыя зямельныя працаўнікі выказалі на старонках «Савецкай Беларусі» свой погляд на гэты праэкт, бо толькі такім шляхам—шляхам калектыўнага абмеркаваньня можна дасягнуць пастаўленай мэты—выкінуць з працэсу ўсё тое, што ў ім лішняе і ўскладняе справу.

А. К.

На варце краіны саветаў.

Пагроза вайны — ёсьць пагроза мірнай працы рабочых і сялян Савецкага Саюзу. Працоўныя, узмацняйце Чырвоную армію. Дапамагайце ў працы ТДА-Авіяхіму.

ДРУЖНА ЗА ВУЧОБУ!

(№ Чырвонашт. полк).

Перад самым сьвятам Кастрычніка каля 200 чалавек маладняка, прайшоўшы карантын, зьмяніў рознакалёрныя сьвіткі і лапці на новенькую шэрую вопратку і боты.

Якасны падбор навабранцаў у мінулым годзе, асабліва ў палкавой школе быў ня досыць добры.

У гэтым годзе палкшкола ўкамплектавана значна лепш. Партыйна-камсамольская праслойка ўпаўне здавальняючая. Значная частка маладняка прымала актыўны ўдзел у працы як у горадзе, так і на вёсцы і досыць разьвита. Таксама ёсьць шмат рабкораў і селькораў, аб чым сьведчыць выпушчаны нумар насьценгазэты ў карантыне. Газэта з якаснага боку была добрая. Мне даводзілася гаварыць з многімі маладымі чыр-цамі, якія ахвотна пайшлі ў палкавую школу. Нават адному навабранцу Слабку Янку можна-б і пя ісьці ў армію на ільготе, а быць залічанаму ў перамены склад, але ён жадае быць камандзіram. Аб зацікаўленасьці вучобай і жаданьні перамагаць цяжкасьці яе думку ўсіх выказаў малады чыр-мец Лашкевіч ў сваёй прывітальнай прамове:

«Усе надзеі, якія ўскладае камандаваньне палка, мы выканаем. Мы ведаем, што цяжка будзе вучыцца, але, як нашы старэйшыя браты перамаглі буржуазею на франтох грамадзянскай вайны, так і мы пераможам усе цяжкасьці баявой падрыхтоўкі».

Будзем спадзявацца, што пры гэткім падборы,пры вялікай ахвоце вучыцца мы праз 8 м-цаў атрымаем добрых малодшых камандзіраў.

Дружна-ж маладняк за вучобу!

Вайскор.

ПЕРШЫЯ ДНІ.

(№ полк, г. Чэрвень).

— Вось яна „чорная" хата, у якой казалі будуць нас трамаць першыя дні жыцьця ў арміі—падумаў Рыгор, перашагнуўшы парог карантыну.

— Кастусь,—нябёлвала радасна прамовіў Рыгор—дык дзе-ж гэта той страшны „чорны" карантын, хіба гэта ён?

— Вядома, што ён.

— Дык чаму-ж гэта яго завуць „чорны", калі ён, сапраўды, ня горш будзе нашай вясковай хаты-чытальні.

І тут яны яшчэ раз акінулі вачыма розныя лёзунгі, партраты, плякаты. Ніжэй крыху на сьцяне вісела „Ільлічоўка"; далей у кутку на вітрыне раскінуліся розныя невялічкія кніжкі. Побач на стале грамафон сьпяваў „Провады".

— Чорным яго мусіць завуць толькі таму, што нас „чорных" сюды зьмяшчаюць, пакуль не „пабелеяць", як і ўсіх чыр-цаў,—адказаў Кастусь.

— Разьдзявайцеся, парадкавайце свае рэчы скрынкі стаўце пад нары, ды адначывайце пасьля дарогі,—загадаў камандзір.

Але Рыгор ніколі і не падумаў-бы, што гэта «загад», ён проста лічыў, што камандзір раіў усім.

Калі ўжо ўсе ўпарадкаваліся, адначылі, разгледзілі ўсё, прыйшоў камандзір і распачаў гутарку:

— Тут вы прабудзеце дзён 12. Вам дадуць па тры ўколы ад розных хвароб. Будзе мэдыцынскі агляд... Пасьля будзе лазьня. Вам дадуць вопратку і толькі тады вы разойдзецеся на падразьдзяленьнях палка.

Пакуль гутарыў камандзір—ціхі асенні вечар апусьціўся пад горадам.

Выходзьце на вячэру! скамандваў камандзір. Праз некалькі хвілін калёна ў сталоўцы.

Пасьля вячэры можна было-б і адпачыць, але угомленасьць на гэты раз усіх пакінула.

У карантыне ўжо нямала мятусіцца шлемаў. Гэта камсамольцы-чыр-цы і камандзіры прышлі пагутарыць з папаўненьнем. Камсамольская група даўно вырашыла яшчэ ў карантыне камсамольцам павесьці гутаркі па азнаямленьню маладняка з умовамі жыцьця чыр-най арміі.

Навакол кожнага чыр-ца, камандзіра—куча хлопцаў. Задаюць розныя пытаньні: аб дысцыпліне, аб гуртках, аб камсамольскай групе.

А Рыгор, доўга слухаўшы гутарку камандзіра, запытаўся:—„Я хачу ў палкавую школу, ці можна гэта"?„Ушколу многа хто з вас хоча, але ўсіх пасласць немагчыма. Камандаваньне будзе старацца, каб усіх, хто хоча—накіраваць у школу".

Доўга яшчэ гутарылі хлопцы, сышалі пытаньні, а калі кончыўся час гутаркі і чыр-цы разыйшліся, Рыгор падумаў:—Гэта дык армія: з кім не спаткайся, не пагавары,—кожны табе сябра і таварыш. А я думаў інакш...

П. Ліхтаровіч.

АРГАНІЗАВАЛІ РАБОЧУЮ РОТУ.

(Горацкі райён).

У г. Горках пры райённым камітэце ЛКСМБ арганізавана рабочая рота з камсамольцаў гарадзкой арганізацыі. Рабочая рота займаецца кожны тыдзень.

НОВАЯ ЯЧЭЙКА ТДА Авіяхіму.

(М. Копысь).

Сялянскі актыў пры камітэце сялянскай узаемадапамогі пастанавіў да 10-цігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі арганізаваць ячэйку ТДА авіяхіму.

Зараз ужо маецца 30 сяброў, ячэйка з кожным днём расьце.

ЯКОЕ КІРАЎНІЦТВА—ТАКАЯ І ПРАЦА.

(Кухцічы, Меншчына).

Сіламі ячэйкі ТДА Авіяхіму ў нас у савгасе Кухцічы быў арганізаваны вайсковы гурток, у які запісалася больш 45 чалавек. Праца гуртка ішла шпаркім тэмпам, прысутнасьць была добрая. Гурток рэгулярна раз у тыдзень праводзіў тактычныя заняткі. Але бюро камсамольскай ячэйкі па гэту працу глядзела скрозь пальцы і таму праца вайсковага гуртка аслабла. Пара камсамольскай ячэйцы падумаць над гэтым пытаньнем і сур'ёзна ўзяцца за працу на васнізацыі моладзі і ўсяго насельніцтва.

СТРОІМСЯ У РОТЫ.

(Дрыбінскі райён).

У м. Дрыбіне райённым саветам ТДА Авіяхіму сумесна з райкомам ЛКСМБ укамплектавана рота з сяброў ТДА авіяхіму і камсамольцаў. Заняткі праводзяцца раз у тыдзень. Наведваньне заняткаў добрае, кожны раз на заняткох бывае 70 чал. У склад роты ўваходзяць ня толькі мужчыны, але і жанчыны. Яны ў роце складаюць асобныя 2 аддзяленьні і вывучаюць вайскова-санітарную справу.

Райсавет ТДА авіяхіму намеціў утварыць па некаторых сельсаветах вайскова-санітарныя гурткі.

Гэткія гурткі ў першую чаргу будуць адчынены ў Гарадзенскім с.-с. пры Капцоўскім броварным заводзе.

АДЗІНКІ ТРЭБА АБ'ЯДНАЦЬ У КАЛЕКТЫЎ.

Белсельбанк (Менск) для заняткаў па васнізацыі карыстаецца цірах Дзяржбанку.

У гуртку вайсковых ведаў налічваецца 15 сяброў,—пры агульным ліку 36 служачых. Гурток наведваецца сябрамі вельмі неакуратна.

Усю працу па васнізацыі ў падшэфным Цеплінскім сельсавеце праводзіць ячэйка КСМ і шэфскае т-ва.

Што датычыцца дакладаў па васнізацыі на чарговых сходах служачых, то іх адбылося ўсяго... адзін.

Наогул уся справа кепска абстаіць, бо пры малым калектыве служачых (36) нельга разгарнуць васнізацыю ў належным абхвале.

Інакш кажучы,—колькі асобных банкаўскіх устаноў, столькі і гурткоў ТДА авіяхіму і гэта паралізуе ўвесь рух васнізацыі.

Трэба як-небудзь рэарганізаваць пастаноўку працы ў гэтай галіне.

К-ў.

Па чатырох краінах.

(Ураженьні і сапраўднасьць).

У рабочым райёне.

Быць у Нямеччыне і не пазнацца з жыцьцём рабочых, значыць многага не бачыць, многае ўтраціць. Узяць-бы Берлін—ты яго, галоўным чынам, пазнаеш у цэнтру; а ў цэнтру паказны бок да таго выдатны і харошы, што ўскраіны ніколі ня могуць канкураваць. Падчышчаны да дзіўнага, прыбраны, цэнтр Берліну какетуе шыкоўнымі магазынамі, багатымі кафэ, вяраднаю і, здаецца, бесклапотнаю публікаю. З таго часу, як было забаронена калскам і бедняком жабраваць на вуліцах гораду—відзе ніхто не пакрывожыць здаволенага буржуя.

Зрэдку, асабліва вечарам, вы сустрэнеце прадаўшчыка або прадаўшчыцу сярнічак і па гэтым дазнаецеся, што жарбацтва хаваецца пад гэту маску. Але яно рэдкае і забароненае. Яго ператорылі ў сумныя, тоўстыя муры, далей ад вока праходжых.

Вальней і нават досыць вольна разгульваюць па вуліцах прастытуткі.

Іх нісколькі не ўбаўляецца, ня гледзячы на некаторы ўздым багацьця краіны.

У адносінах да прастытутак з пераходам кастрычніка ўведзены новы закон. Згодна гэтаму закону, прастытутка вызвалены ад усіх прыніжаючых іх грамадзянасьцю, як: мэдыцынскі агляд, жоўтыя білеты, абмежаваньне ў правах, недапушчэньне ў тыя ці іншыя становы. Нэўней кажучы, гэтым заканам як-бы прастытуцыя «адмяняецца». Прастытутка ёсьць жанчына роўная ўсім, і нікому няма жаднае справы да таго, куды і што ідзе яна з мужчынам... Мажліва гэтым тлумачыцца тая сьмеласьць гэтых жанчын, якая выказваецца ў адкрытым і сьмелым іх торгу з мужчынамі на воку паліцыі...

Цэнтр ва ўсіх адносінах прыстасаваны да абслугоўваньня буржуазеі. І не зазірнуўшы на ўскраіны—ня можаш выявіць другога, іншага твару вялікага гораду. Розьніца паміж цэнтрам і ўскраінамі ў Берліне вельмі выразная і глыбокая. Навуковая і ўсходняя часткі гораду, амаль ня цалкам заселеныя рабочымі, выдаюць сабою процілеглы цэнтру сьвет. Публіка шмат бяднейш адзетая, прасьцейшыя магазыны з таньнейшымі таварамі. Цемнаватыя, бяз жадных рэклям вуліцы. Свае асабовыя кафэ, піўнушкі, танцулькі, кіно. Прыкметны бруднейшыя вуліцы.

Не пабыць на ўскраінах—ня можна. І мы паставілі напрыменны параграфам у сваю праграму—пабываць у рабочым райёне. Дзякуючы майму ранейшаму знаёмству з некалькімі нямецкімі рабочымі, мы адным вечарам наехалі да аднаго з іх, каб пагутарыць з ім аб сучасным становішчы нямецкага рабочага (у Берліне), аб яго настроях, адносінах да нашага Саюзу. Мой знаёмы жыве каля Нейкельну, усходняй часьці Берліну, і працуе на паліграфічным прадпрыёмстве з шасьцюстамі чалавек. Ён мае шырокае знаёмства з берлінскімі рабочымі многіх галін прамысловасьці. Гэта дазволіла нам у гутарках з ім атрымаць тыя веды з рабочага жыцьця, якія нас цікавілі наперад за ўсё.

З паведамленьняў знаёмага мы даведаліся аб жыцьці нямецкага рабочага ў Берліне наступнае: нямецкія друкарскія рабочыя, болей забясьпечаныя, зарабляюць сярэднім сто рублёў у месяц на нашы грошы. Пры гэтым, аднак, спэцыялістыя, як лінатыпшчыкі, офцэтнікі і інш. даганяюць свой заработак да двухсот рублёў. Тарыфная аплата ў іх пабудавана не па колькасьці вырабу, а па спэцыяльнасьцям, павышаючыся і паніжаючыся ад росту стажу. Калі, скажам, наборшчык мае 21 год і працуе ў прадпрыёмстве тры гады, ён атрымоўвае адну стаўку; на дваццаць другім годзе стаўка павялічваецца і стаіць на адным узроўні чатыры гады. Далей ізноў паднімаецца... Працоўны дзень у друкароў васьмігадзінны. Прыход на фабрыку рэгіструецца каляндарным спосабам. Спазьненьняў недапускаецца, і за кожную прапушчаную хвіліну ў канцы тыдню вылічваецца. Па згавору даецца мажлівасьць у тыдзень спазьніцца на 15 хвілін. Але гэта ня значыць, што рабочы можа сыстэматычна рабіць гэтыя спазьненьні. Тры спазьненьні засаб цягнуць за сабою канфлікт, які канчаецца звальненьнем рабочага. Пры самай працы нагляд ня вельмі строгі—гэта тлумачыцца тым, што нямецкі рабочы вельмі старэнна і пільна працуе адведзены яму час. Працоўная самадысцыпліна ў яго надзвычай разьвіта. Праўда, прадпрыёмцы не здавальняюцца гэтым, і ў фордызіраваных прадпрыёмствах застаўляюць рабочых аддаваць апошнія сілы для абагачэньня прадпрыёмца. Канвэйерная с

Вёска сёньня.

Змагаемся з балотамі.

Мэліарацыйная праца ў раёнах быўшае Случчыны, далучанай у цяперашні час да Бабруйшчыны—праца новая.

У дарэвалюцыйныя часы праца гэтая амаль што не праводзілася, і толькі ў 1924 годзе праца па мэліарацыі балот гэтых раёнаў пераходзіць на плянавыя рэйкі. Арганізоўваюцца мэліарацыйныя таварыствы, выдзяляюцца дзяржаўныя сродкі на правядзеньне мэліарацыйных работ.

Цяпер па Любанскаму, Старадароскаму, Слуцкаму, Старобінскаму і Чырвона-Слабодзкаму раёнах налічваецца 22 мэліарацыйныя таварыствы. Гэтыя таварыстыя яднаюць 2220 сяброў.

Мэліарацыйнымі таварыствамі праводзяцца працы па асушцы на 7900 гэктарах балота.

Атульныя дасягненьні ў справе мэліарацыі і культуртэхнікі балот па гэтых раёнах на сёньняшні дзень даволі значныя. На сродкі дзяржавы праведзена рэгуляваньне рэк на працягу 12 кілёмэтраў. Дзякуючы гэтай працы, аказалася асушаным 4500 гэктараў балота.

Апрача таго, пракопана 23 кілёмэтры канаў і інш. Гэта праца праведзена на сродкі дзяржавы. На сродкі мэліарацыйных таварыстваў праведзены дасьледваньні ўсёй плошчы балота, якую мяркуюць асушыць таварыствы, пракопана 17 кілёмэтраў канаў, асушана 70 гэктараў балота.

Значная праца праароблена па культываваньню балот. Абсталёваны два пракатныя пункты з балотна-лугавымі прыладамі, закладзены тры насенных гадавальнікі лугавых траў у сялянскіх гаспадарках.

Закладзена ў гэтым годзе было 5 паказальных вучасткаў з пасевам траў на балоце.

Такую дапамогу справе культываваньня балот дала дзяржава. У сваю чаргу сялянства, арганізованае ў таварыствы, не засталося ў даўгу. Ім ачышчана ад хмызьняку 300 гэктараў балота, узорана—140 гэкт. і засеена 53 гэктары.

Паказальныя вучасткі далі нябывалыя да гэтага часу ўраджаі. Віка в аўсом давала 300-400 пудоў сена, капуста 1700 пудоў і г. д.

Асабліва актыўнымі у справе мэліарацыі балот трэба адзначыць 1-е і 2-е Старобінскія таварыствы. Апрача таго сваёй інтэнсыўнасьцю працы вызначаюцца Рыбчынскае таварыства, Любаньскага райёну і Языльскае—Старадароскага раёну.

А. Дамброўскі.

Бабруйшчына.

На рэйках інтэнсіфікацыі сельскай гаспадаркі,

(З сельгаспадарчых выставак).

«Дзень Ураджаю» ў гэтым годзе праводзіўся ў нашым раёне крыху інакш ад мінулых гадоў. Сёлета, апрача раённай выстаўкі, былі праведзены 2 падраённыя ў в. Янушковічах і камуне «Чырвоны Кастрычнік».

На падраённых выстаўках экспанатаў дастаўлена было мала, у гэтым пашкодзіла дрэнная пагода. Аднак, выстаўкі праходзілі дось ажыўлена і пры зацікаўленасьці насельніцтва.

Раённая выстаўка была назначана на 30 кастрычніка.

Пашкодзіла справе і тут дрэнная пагода: дождж, холад. Зранку ня было ніякай надзеі, што выстаўка наогул адбудзецца, але усёж-такі к 12 гадзінам дню сабралася гаспадароў 113, прывёзшы калі 350 экспанатаў.

Сярод экспанатаў першае месца займае **гародніна і паляводзтва.** Гр-н в. Слабады Давідовіч Язэп прывёз: капусту «Сабураўку» адзін качан важыць 20 фунтаў. **Ураджай з гэктару зямлі гэта капуста дае 2.400 пудоў.**

Буракі «экіндорскія» важаць ад 5 да 8 фунтаў штука. Ураджай з гэктару—2000 пуд. Прывёз Давідовіч і агуркі—па 2 ф. штука.

Ня горшая гародніна была **ў сав. гаспадарцы «Луцаўшчына»** і камуне **«Чырвоны Кастрычнік».** Буракі «экіндорскія» іх важаць па 18 фунтаў, турнэпс вагой па 20 фунтаў, моркава па 3½ фунты.

Не засталася ззаду і школа. Буракі Гаенскай школы «экіндорскія» выключна былі саджаны па штучным угнаеньні, і гэктар даў 4000 пудоў.

Поплеч—селянін Уладыка Антось, прывёз капусту простага гатунку, якая хоць і добра ўрадзіла, але качан важыць 7-8 фунтаў і ўраджай з гэктару 960 пуд., менш, як на палову ў параўнаньні з гатункавай капустай.

Гр-н Грэбеньнікаў з пас. Н. Радзевіч прывёз бульбу, саджаную на гнаі з мінэральным угнаеньнем. Ураджай бульбы з гэктара даходзіць да 1522 пуд., што амаль ніколі ня бывае бяз штучнага ўгнаеньня.

Вылучаецца культурная гаспадарка гр-на хут. Антосіна Хадасэвіча. **Жыта „Петкускае" ў яго дае 130 пудоў, канюшына—400 пуд. з гэктару.** Хадасэвіч ня толькі ўзьнімае гаспадарку для сябе, ён дапамагае ў пашырэньні культуры і сярод суседзяў. У гэтым годзе абмяняў жыта 37 пуд. Севазварот шматпольны.

— Хоць далёка мне, 18 вёрст,—кажа 85-гадовы дзядуля Паталей, але і я прывёз ячмень «Прыцэс». Урадзіў добра, **з дзесяціны 180 пуд. Хоць і на пясчанай глебе** і ня просты авёс,—просты дае 60 пуд. з дзесяціны. Няхай, кажа, паглядзяць людзі...

Дзед Паталей таксама прыкладны гаспадар. Добрая ў яго бульба, добрыя і яблыкі прывёз на выстаўку. Прыехаў першы.

Гр-не в. Гасьцілавічы Галдовіч П. і Груздзь Юлік паказваюць ячмень, пасеяны рукой у Галдовіча і даў з гэктару па штучнаму ўгнаеньню 79 пуд., а пасеяны радавой сеялкай на такой самай глебе 87 пудоў, у Груздзя 84 пуды, пасеяны па штучным угнаеньні, і 67 пуд. бяз штучнага ўгнаеньня.

Шмат было і іншых гаспадароў, у кожнага з іх вылучаецца той экспанат, які або сеяны сеялкай, або па штучнаму угнаеньню, або гатункавае, адабранае насеньне.

Апрача экспанатаў на гародніцтву і паляводзтву, было 9 жарабкоў мяйсцовай палешанай пароды, некалькі сьвіней, а таксама рагатай жывёлы. Сярод рагатай жывёлы адна карова была «ангельскай» пароды. З сьвіней вылучаецца—сьвіньня Міхалоўскага сьвінагадоўчага т-ва белай ангельскай пароды, важыць, якая каля 6 пудоў—маючы 5 месяцаў.

Відаць **пашырэньне малочнай прамысловасьці.** Калі ў прайшоўшыя гады ў гэтым напрамку выстаўка нічога ня бачыла, дык сёлета камуна «Чырв. Кастрычніка» і савгас Лагаза паказалі «галіцінскае» масла і галяндзкі добрай якасьці сыр. Камуна і Лагава маюць малочныя заводы.

Разьвядзеньнем саду занялася сав. гасп. «Луцаўшчына». На выстаўцы розпага гатунку шчэпы. Шчэпаў «Луцаўшчына» мае 2-хгадовых 800 шт. і аднагадовых 16 тысяч штук.

Гр-н Давідовіч прывёз насеньне яблынь і шчэпаў—«акуліроўкі», якіх мае некалькі сот. Былі і іншыя. Сав. гаспадарка Лагаза паказвала машыны: трактар, радавую сеялку.

Камісія за лепшыя экспанаты выдала прэміі.

Натурай—51, грошовых—11 і ганаровых дыплёмаў—20.

Трэба адзначыць, што выстаўка, хаця і не паказала таго, што яна магла-б паказаць пры лепшым надворʼі, але прайшла дось добра. Яна паказала, што сельская гаспадарка, хоць павольным крокам, але ідзе ўперад, к інтэнсіфікацыі. Кожны год сярод экспанатаў больш бачым экспанатаў палешанага, ня простага гатунку, з лепш культурна апрацованай глебы.

Выстаўка таксама паказала, што апрача земляробства сельская гаспадарка пачынае браць ухіл у іншыя галіны, як агародніцтва, садоўніцтва, малочныя вырабы. У двух апошніх выпадках прыкладам, пачынаючым справу і становяцца камуна і савхозы. Саўхозы, і камуна наогул аперадзілі селянскую гаспадарку і становяцца прыкладам у вядзеньні гаспадаркі.

Засталіся толькі калектыўныя гаспадаркі. Іх у раёне 3 і ні адна нічога не паказала, ні адна ня мае чым пахваліцца.

Шырыцца і машынізацыя.

Тыя гаспадары, якія прайшоўшыя гады і ня думалі, у гэтым годзе вялі пасеў радавымі сяўнікамі і прывезьлі дасягненьні паказаць на выстаўцы.

Ад іх прыклады возьмуць дзесятак новых, на будучы год заместа 2, такіх будуць дзесяткі.

Я. Кручонак.
У. Давідовіч.

Лагойск, Меншчына.

Хроніка.

У Нар. Кам. Рабоча-Сялянск. Інспэкцыі.

(З пасяджэньня калегіі ад 12 лістапада).

ЗА НЯЎВАЖЛІВЫЯ АДНОСІНЫ ДА СЯЛЯН.

Калегія разглядзела справу па заяве гр-н вёскі Рудністаўбінскай, Гомельскай акругі, аб няправільным землеўпарадкаваньні і несканчаньні яго, у сувязі з чым вёска разарылася і засталася без сенажаці. РСІ даручыла расьсьледаваць гэта пытаньне і даць тлумачэньне, у чым тут справа. Старшыня вышэйшага кантролю НКЗ т. Лабаноўскі быў у Гомелі па гэтай справе і аднесься да яе фармальна, прычым справа на месцы ня была вырашана. Калегія НК РСІ паставіла на від Лабаноўскаму за фармальныя і няўважлівыя адносіны да сялянскіх спраў і даручыла даць канкрэтныя ўказаньні на месцы па гэтым пытаньні.

СПРАВА МЕНСКАГА НАФТАСКЛАДУ

Абсьледаваньне Менскага нафтаскладу выявіла, што звароты яго павялічыліся на 29 проц., але побан з гэтым павялічыліся і выдаткі на 25 проц., тады як, наадварот, яны павінны былі зьнижацца. Штат павялічаны і ня мае поўнай нагрузкі; прычым у рэалізацыі нафты прыватнік займае 31 проц., што таксама вяўляецца ненармальным. Калегія даручыла Наркамгандлю ўрэгуляваць продаж нафты дзяржаўнымі і кааперацыйнымі арганізацыямі, выканаць дырэктыву аб скарачэньні накладных выдаткаў да 30—32 проц., скараціць пасаду намесьніка загадчыка складу, а таксама скараціць штат наогул.

20 ПРОЦ. СКАРАЧЭНЬНЯ ВЫДАТКАЎ ПАВІННА БЫЦЬ СКОНЧАНА ДА 1 СЬНЕЖНЯ.

Калегія заслухала інфармацыю аб ходзе скарачэньня на 20 проц. адм.-гасп. выдаткаў і дала суровую дырэктыву аб выкананьні гэтага скарачэньня да 1 сьнежня. Адстаюць у скарачэньні выдаткаў па прамысловасьці: Белдзяржстрой, Папертрэст, Белдзяржсьпірт, махорачная ф-ка (Віцебск), Менпвой, Сярпіковы трэст, а Віцебская акцыярная ф-ка павялічыла выдаткі на 12 проц. у параўнаньні з мінулым годам.

Што датычыцца банкаў, то 20 проц. скарачэньне выпаўнена толькі прамбанкам.

АБ ПАЛЕПШАНЬНІ ТЭХНІЧНАГА І РАХУНКАВОДНАГА АПАРАТУ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ.

Прыняты цэлы шэраг мерапрыёмстваў аб палепшаньні тэхнічнага і рахункаводнага апарату прамысловасьці. Даручана ВСНГ перагледзіць інжынэрна-тэхнічны склад у сэнсе яго больш рацыянальнага разьмеркаваньня, а таксама перагледзіць рахункаводны склад у сэнсе яго палепшаньня, для чаго даручана ВСНГ супольна з Нар. Кам. Асьветы распрацаваць мерапрыёмствы па палепшаньні бухгальтарскага і рахункаводнага апарату прамысловасьці.

УЗБУЙНЕНЬНЕ ЖЫЛТАВАРЫСТВАЎ У МЕНСКУ.

Згодна пастановы праўленьня Белжылсаюзу, колькасьць жылтаварыстваў скарачаецца з 36 да 21. Жыльлёва-будаўнічых кааператываў застаецца 7. Скарачэньне дазволіць значна павялічыць працу па жыльлёваму будаўніцтву.

Жыллошча кожнага ўзбуйненага жылтаварыства будзе дасягаць ад 10 да 15 тысяч квадр. мэтраў. У сувязі з узбуйненьнем жылтаварыстваў скарачаецца лік абслугоўваючых штатных адзінак.

МЭДЫЦЫНСКАЯ ДАПАМОГА ЗАСТРАХОВАНЫМ.

У мінулым 1926-27 годзе па Менску пяцю райамбуляторыямі і цэнтр. раб. амбуляторыяй абслугоўвалася да 30.000 застрахованых. Было праведзена да 1.500.000 амбуляторных прыёмаў і да 200.000 наведваньняў на дому.

ХЛЕБ З МЭХАНІЧНАЙ ХЛЕБАПЯКАРНІ.

Сёньня МЦРК пускае новы хлебазавод. З гэтага часу пачынаецца на заводзе масавая выпечка хлеба.

Школьная краязнаўчая канфэрэнцыя.

ЦБ краязнаўства склікае ў Менску ў другой палове лістапада школьную краязнаўчую канфэрэнцыю.

Гэта канфэрэнцыя абмяркуе і вырашыць цэлы шэраг пытаньняў, зьвязаных з разьвіцьцём краязнаўчай справы сярод вучняў школ.

Курсы для старшынь і сэкратароў нацсаветаў.

Прэзыдыум ЦВК БССР на сваім пасяджэньні пастанавіў арганізаваць у Менску курсы для старшынь і сэкратароў нацыянальных саветаў БССР.

Новы від страхаваньня пасеваў.

Дзяржстрах БССР распрацоўвае праэкт страхаваньня пасеваў ад вымачкі, вымярзаньня і выправаньня. Гэта страхаваньне ўводзіцца на жаданьні самога насельніцтва і мясцовых органаў улады.

Новае дасягненьне на культурным фронце.

У дні сьвяткаваньня 10-цігодзьдзя Кастрычніка ў Койданаўскім раёне адчынілася цэнтральная польская школа сялянскай моладзі.

1000 беларускіх гурткоў на прадпрыёмствах.

На ўсіх прадпрыёмствах Беларусі з 2400 розных гурткоў працуе 1000 гурткоў беларусазнаўства.

700 вагонаў жыта і жытняй мукі будзе завезена ў лістападзе.

Для забесьпячэньня БССР хлебам Белкаапсаюз мяркуе ў лістападзе завезьці 700 вагонаў жыта і жытняй мукі.

66.000 руб. адпушчана на радыёперадачы ў БССР.

На бягучы 1927-28 апэрацыйны год Менскай і Гомельскай радыё-тэлефонным станцыям адпушчана 66.000 руб. У мінулым годзе станцыям было адпушчана 30.000 руб.

На 200.000 руб. вадаправодкай арматуры.

Белпайгандаль заключыў дагавор з металёртрэстам на дастаўку вадаправоднай арматуры на суму 200.000 руб.

Перавыбарная кампанія ў спажыв. кааперацыі.

Белкаапсаюз наставіў правесьці перавыбарную кампанію па спажывецкай кааперацыі ў працягу часу з 20 лістапада г.г. да 15 студзеня 1928 г.

«Беларускае земляцтва» у Аргентыне на дапамогу яўрэйскім пераселенцам.

У Буэнос-Айрэсе (Аргентына) арганізаваўся „Саюз беларускага земляцтва".

Згодна статуту саюзу, 20 проц. усіх яго даходаў ідуць у карысьць яўрэйскіх пераселенцаў з Беларусі, якія пераселяюцца ў іншыя мясцовасьці Савецкага Саюзу.

ШТО ПАКАЗАЎ VI УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД ПРАФСАЮЗАЎ.

(Даклад старшыні ЦСПСБ т. Перапечкі на сходзе прафактыву г. Менску).

VI-ы ўсебеларускі зьезд прафсаюзаў, які адбыўся напярэдадні 10-й гадавіны Кастрычніка, падагуліў дасягненьні, якіх дабіліся рабочыя БССР за 10 год існаваньня савецкай улады. Зьезд паказаў, што наша гаспадарка расьце і што ў ёй узмацняюцца сацыялістычныя элемэнты.

За апошнія гады заработная плата вырасла на 14—15 проц. Рацыяналізацыя вытворчасьці ня толькі ня зьнижае заработнай платы, а, нават, дапамагае павышэньню яе; у кравецкай прамысловасьці яна павысілася на 38 проц., у акулярнай на 22 пр. і г. д.

Буйнешым нашым недахопам зьяўляецца разрыў паміж зарплатай і прадукцыйнасьцю працы. У той час, калі першая павысілася на 14—15 проц., другая ледзь дасягнула 6 проц. Зразумела, што гэта зьяўляецца вялікай небясьпекай для нашай прамысловасьці, і на гэты фронт трэба зьвярнуць максымум увагі.

Існуюць недахопы ў галіне тарыфнай і нарміровачнай працы. Яшчэ да гэтага часу на некаторых нашых прадпрыёмствах наглядаецца разрыў у зарплаце паміж зьдзельшчынай і пагадзіннай працай аднэй кваліфікацыі; бываюць выпадкі, калі малакваліфікаваны рабочы атрымлівае большую зарплату, чым кваліфікаваны.

Нарміраваньне працы таксама зьяўляецца слабым месцам у нашай тарыфна-эканамічнай працы. Гэта пытаньне павінна ўвайсьці ў кампэтэнцыю прафсаюзных органаў. Усялякія расцэнкі і нарміроўкі павінны разглядацца ў РКК.

У нас налічваецца да 9 проц. агульнага ліку рабочых беспрацоўных. Каля 30 проц. гэтае масы ні разу не працавала па найму. Галоўны кантынгент беспрацоўных камплектуецца за кошт перанасяленьня вёскі.

На лініі сацстраху дапамогу атрымлівае зараз 48 проц. беспрацоўных (замест 34 проц. у мінулыя гады). Апроч таго, прафсаюзы дапамагаюць яшчэ 15—20 проц. беспрацоўных. Грамадзкія работы абхопліваюць штогод да 12 пр. усіх беспрацоўных. У працакалектывах занята да 8000 беспрацоўных.

Культпраца на многіх вучастках яшчэ кульгае; слабая самадзейнасьць мас.

У нацыянальным пытаньні ёсьць дасягненьні ў сэнсе абслугоўваньня прафсаюзамі працоўных на нац. мовах, але гэтых дасягненьняў нельга прызнаць зусім здавальняючымі. Нашы прафсаюзныя бібліятэкі ня маюць патрэбнага ліку беларускіх і яўрэйскіх кніг, у клюбах масавая работа слаба праводзіцца на беларускай і яўрэйскай мовах.

Прывітальныя тэлеграмы на імя ўраду БССР.

На імя ўраду БССР ў дні сьвяткаваньня 10-й гадавіны Кастрычніковай рэвалюцыі паступілі прывітальныя тэлеграмы: а) ад урачыстага сходу ў Магілеве з поваду распачацьця прац па будаваньні новае масы, б) ад Чачэрскага РВК і в) ад грамадзян Дукоркі.

Камсамольскія канфэрэнцыі.

Бюро ЦК ЛКСМБ зацьвердзіла наступны тэрмін правядзеньня канфэрэнцый па арганізацыі.

Райённыя канфэрэнцыі будуць адбывацца з 10 сьнежня 1927 г. да 1 студзеня 1928 г., акруговыя канфэрэнцыі—з 15-га студзеня да 1 лютага 1928 г.

Усебеларускі зьезд камсамолу Беларусі склікаецца 1 сакавіка 1928 г.

Нарада па малочнай гаспадарцы.

На гэтых днях у Віцебску адбылася нарада па малочнай гаспадарцы інструктароў Белсельсаюзу і працаўнікоў зямельных устаноў. На нарадзе разгледжана пытаньне аб арганізацыі ў БССР сеткі масла-сыраварных заводаў.

Малочная гаспадарка БССР, як значная прыбытковая галіна нашай сельскай гаспадаркі, павінна быць у асяродку ўвагі агранамічнай і кааперацыйнай дапамогі насельніцтву.

Разьвіцьцё малочнай гаспадаркі цесна зьвязана з землеўпарадкаваньнем, мэліарацыяй і разьвядзеньнем кармавых траў і карапродаў.

Усе мерапрыёмствы ў галіне разьвіцьця малочнай гаспадаркі павінна праводзіцца плянавым парадкам, дзякуючы чаму будзе магчымасьць сканцэнтраваць у адным месцы сілы і сродкі.

Найбольш адпаведнай сялянскай арганізацыяй зьяўляюцца кавтрольныя т-вы. Неабходна ўстанавіць больш сьціслую сувязь паміж малочнымі і кантрольнымі т-вамі, каб ня было разрыву ў рабоце і росьце гэтых с.-г. арганізацый.

800.000 руб. на мэліарацыю.

Крэдытны плян Белсельбанку на 1927-28 г. прадугледжвае асыгнаваньне 800.000 руб. на крэдытаваньне мэліарацыйных работ.

Выдача ссудаў пад аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі.

Пад аблігацыі пазыкі індустрыялізацыі з 16-га лістапада г. г. будуць выдавацца ссуды ў разьмеры 60 проц. біржавога кошту аблігацый.

Купля і продаж, а таксама выдача ссудаў пад аблігацыі дзяржаўных пазык адбываецца ва ўсіх цэнтральных банках, іх аддзяленьнях і агенцтвах, а таксама ва ўсіх цэнтральных касах ашчадкасьці і іх гарадзкіх аддзяленьнях.

Рост ашчаднай справы ў БССР.

На 1-га кастрычніка 1926 г. у БССР налічвалася 442 кас ашчадкасьці, у якіх было 24691 укладчыкаў з 1.435.357 укладаў.

На 1-га кастрычніка 1927 году ёсьць нас ашчадкасьці 468, укладчыкаў—56018, а ўкладаў—3.557.476 руб.

Беларускі клюб у Маскве.

У Маскве пражывае да 15 тысяч беларусаў. Для культурнага абслугоўваньня іх па Арбаце адчынецца беларускі клюб.

УСЕБЕБАРУСКІ ПАЖАРНЫ СКЛАД.

Дзеля плянавай дастаўкі машын і, наогул, пажарнага інвэнтару ў вясковыя пажарныя дружыны, НКУС мяркуе арганізаваць усебеларускі пажарны склад. Да арганізацыі яго вядзецца падрыхтоўчая праца, заключаюцца ўмовы з Масквой аб водпуску неабходных пажарных матар'ялаў і інвэнтару.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Сёньня, 15 лістапада, роўна а 8 гадзіне ўвечары ў пакоі № 4 адбудзецца адчыненьне школы для тэхпрацаўнікоў, членаў працасьветы.

Усім запісаўшымся ў школу—зьявіцца спачасова. Непасьпеўшыя яшчэ запісацца ў школу тэхпрацаўнікі могуць запісацца непасрэдна ў загадчыка школы 15 лістапада перад адчыненьнем школы.

— У сераду, 16 лістапада, роўна а 8-й гадз. увечары адбудзецца нарада прафактыву саюзу працасьветы.

АБВЕСТКА ДНЮ:

1. Аб задачах культпрацы на бліжэйшы перыяд.
2. Аб задачах клюбнае працы дому Асьветы.
3. Бягучыя справы.

Запрашаецца настаўніцтва.

Гр-ка г. Полацку ЗАЙЦАВА Усьціньня Пятроўна (паходз. з гр-н г. Жытоміра), пражыв. па Інтэрнацыянальнай вул. у д. № 2, хадайнічае аб зьмене імя Усьціньня на імя „Таісія".

Асобы і ўстановы, якія маюць што супроць, павінны паведаміць аб гэтым у Полацкі ЗАГС у месячны тэрмін.

ПАСТАНОВЫ і ЗАГАДЫ УРАДУ БССР.

ПАСТАНОВА

Савету Народных Камісараў Беларускае ССР.

Аб зьвяльці з тав. Філіпава, М. П., абавязкаў Намесьніка Кіраўніка Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы БССР.

У зьвязку з ад'ездам тав. Філіпава, Мікалая Паўлавіча, у Інстытут Эксперыментальнае Статыстыкі для навучаньня, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе зьняць з яго абавязкі Намесьніка Кіраўніка Цэнтральнае Статыстычнае Ўправы БССР.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. Галадзед.

Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР М. Мароз.

3 лістапада 1927 г.
г. Менск.

ПОСТАНОВЛЕНИЕ

Совета Народных Комиссаров Белорусской ССР.

Об освобождении тов. Филиппова, М. П., от обязанностей Заместителя Управляющего Центрального Статистического Управления БССР.

В связи с от'ездом тов. Филиппова, Николая Павловича, в Институт Экспериментальной Статистики для обучения, Совет Народных Комиссаров БССР постановляет освободить его от обязанности Заместителя Управляющего Центральным Статистическим Управлением БССР.

Председатель Совета Народных Комиссаров БССР М. Голодед.

Управляющий Делами Совета Народных Комиссаров и Экономического Совещания БССР М. Мороз.

3 ноября 1927 г.
г. Минск.

СУД.

ПРЫГАВОР ПА СПРАВЕ БАБРУЙСКІХ СУДОВЫХ РАБОТНІКАЎ.

У 12 гадзін ночы 12 лістапада Менскі акруговы суд вынес прыгавор па справе бабруйскіх судовых работнікаў. Суд прызнаў Пётру Арцішэўскага віноўным у злачынстве, якое прадугледжана 1 ч. 114 артыкулу Крым. Кодэксу і прыгаварыў яго на год зьняволеньня. З прычыны таго, што Арцішэўскі адбыў кару папярэдняя зьняволеньнем, суд пастанавіў з-пад варты яго вызваліць. Бацюню Івана суд прызнаў віноўным у злачынстве, прадугледжаным артыкулам 114-а Крым. Кодэксу і прыгаварыў яго на год зьняволеньня. Дастасаваўшы да апошняга амністыю 10-й гадавіны, суд Бацюню з-пад варты вызваліў.

АБРАБАВАЛІ 60 КАПЕЕК.

Селянін з Мазыршчыны Сілецкі паехаў у вёску Варацец на Гомельшчыне.

Мясьціна незнаёмая. Пакруціўся ў палёх, збіўся з дарогі і ня ведае, у які бок накіравацца.

Недалёка на ўзгорку Сілецкі ўбачыў нейкую вёску і паехаў туды.

Сустрэўшы двох сялян, ён запытаўся:

— Браточкі, ці ня ведаеце дарогі ў вёску Варацец?

— Як ня ведаць, ведаем. Вось у гэты бок.

Адзін з гэтых сялян нават вывеў Сілецкага за вёску Чэхі і паказаў яму дарогу. Сілецкі паехаў.

Не праехаў ён і вярсты ад вёскі Чэхі, як пачуў вокрык:

— Стой!

Сілецкі спыніў каня і ўбачыў, што да воза падходзяць два чалавекі, у аднаго з якіх у руках быў абрэз ад вінтоўкі.

— Давай грошы!—скамандаваў адзін з падышоўшых.

— Аддуць у мяне грошы?

Рабаўшчыкі пачалі трасьці кішэні Сілецкага, дзе знайшлі толькі 60 кап.

Адышоўшы ў бок, адзін пытаецца ў другога:

— Забіць яго ці пакінуць жывым?

— Няворта, няхай едзе. Мо' ня будзе скардзіцца ў суд.

Сілецкі ў суд паскардзіўся. На вочнай стаўцы ён пазнаў тых самых сялян, якія паказвалі яму дарогу да вёскі Варацец. Яны аказаліся Якімам Дрончанкам і Тодарам Данцуком.

Выязная сэсія Гомельскага акруговага суду ў мястэчку Хойніках прыгаварыла Дрончанку і Данцука на 4 гады зьняволеньня кожнаму.

Асуджаныя падалі касацыйную скаргу ў вярхоўны суд, які зацьвердзіў прыгавор Гомельскага акруговага суду, але дастасаваў да іх справы амністыю 10-цігодзьдзя Кастрычніка ва рэвалюцыі і скараціў ім кару да 2-х год зьняволеньня кожнаму.

С Аз.

СУДОВАЯ ХРОНІКА.

Помста.

Хведар Абіралаў памсьціўся на Я. Фралова і, намовіўшы З. Ладыга і Цярэшкава, моцна пабіў Фралова, ад чаго апошні памёр.

Выязная сэсія Аршанскага акруговага суду прыгаварыла Абіралава, Ладыга і Цярэшкава на 5 год зьняволеньня кожнага. Вярхоўны суд дастасаваў да гэтай справы амністыю 10-цігодзьдзя і скараціў ім кару напалову.

Рознае.

ВЫВУЧЭНЬНЕ ПРАСТУПНАСЬЦІ.

У Маскве адчынілася аддзяленьне дзяржаўнага інстытуту па вывучэньню праступнасьці і праступнікаў. Гэты інстытут зьяўляецца адзіным ў Эўропе.

АМЭРЫКА ВЫВУЧАЕ КАСТРЫЧНІК.

У Нью-Ёрку арганізуецца інстытут на вывучэньню Кастрычніка ва рэвалюцыі. Амэрыканскі вучоны Гольдэрг, які зараз у Ленінградзе, пачаў складаць для гэтага інстытуту слоўнік навейшых расейскіх слоў, узьнікшых за апошніх 10 гадоў.

ЖАНЧЫНА—КАПІТАН.

У Нарвэгіі жанчына вытрымала экзамен на годнасьць карабельнага капітана. Жанчыне-капітану ўсяго 19 гадоў. Гэта першы ў сьвеце выпадак.

«МІЛЬЁН ГАДОЎ ТАМУ НАЗАД».

У Нью-Ёрку адчынена навуковая выстаўка „Сьвет мільён гадоў таму назад". На адноўленых там пейзажах выстаўлены дагістарычныя жывёліны ў натуральную велічыню. Яны аўтаматычна рухаюцца.

ТЭЛЕФОНЫ Ў ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ.

У Злучаных Штатах штодня адбываецца 70 мільёнаў тэлефонных гутарак на 17 мільёнаў апаратаў. Агульны працяг усіх правадоў сёньня—60 мільёнаў кілёмэтраў.

ЛЁНДАНСКІЯ ГАЛУБЫ.

Лёнданская рада пастанавіла перабіць прынамсі палову галубоў, якія гнездзяцца на даддашах сярод архітэктурных аздаблеваньняў вялікіх будынкаў.

Галубы робяць там шмат шкоды, забруджваючы будынкі і зьнішчаючы дзюбамі гзымсы, кветкі і фігуры, зробленыя з мяккага камня.

ПРОЦІ МОДЫ АБЦІНАНЬНЯ ВАЛАСОЎ.

Японскае міністэрства асьветы выдала загад, які забаранае настаўніцам усіх дзяржаўных школ абцінаць валасы наводле пануючай цяпер моды, якая распаўсюджана і ў Японіі. Міністэрства матывуе свой загад тым, што выгляд настаўніц з абпятымі валасамі робіць дрэнны ўплыў на дзяцей.

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

ТЭАТР-КІНО.

БЕЛАРУСКІ ДРУГІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТР.

Чацьвер, 17 лістапада.
„СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ", камэдыя у 3-х дзеях.
Другі агульнадаступнік для студэнцкае моладзі.

Пятніца, 18 лістапада.
„СОН У ЛЕТНЮЮ НОЧ", камэдыя ў 3-х дзеях,

Субота, 19 лістапада.
„АСТАП", народная камэдыя ў 3-х дзеях.
Зачынены паказ для саюзу Шэйнікаў.

Нядзеля, 20 лістапада,
„ЦАР МАКСІМІЛЬЯН", народная драма ў дзьвюх дзеях з інтэрвэдыем.

Пачатак а 8-й гадз. увечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА» — З 15-га лістапада **„ЯД"** Па п'есе Луначарскага. Сац.-бытавая драма ў 7-х частк.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — З аўторка, 15 лістапада. Вялікая мастацкая пастаноўка **„Катерина Измайлова"** драма у 7 частках. АНОНС Бліжэйшы рэпэртуар—2 сусьветныя баявікі: „Человек и ливрея" і „Парижанка".

КІНО «ПРАЛЕТАРЫ». — На гэтым тыдні Менск убачыць яшчэ раз **„ПОЭТ І ЦАР".**

КІНО „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ". — Выдатная фільма ў 10-х частках. **„ДВЕ СИРОТКИ".** У гал. ролях—Ліліан і Доротэй Гіш.

ПАСТАНОВА
ВЫШЭЙШАГА САВЕТУ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ БССР
аб абавязковай паверцы і кляйменьні пурак у БССР.

Гор. Менск, 11 лістапада 1927 г. № 23.

На падставе арт. 6 палажэньня аб мерах і вагах, зацьверджанага ЦВК і СНК СССР за 6-VI-24 г. (Весьнік ЦВК, СНК і СПА СССР за № 6 1924 г., арт. 202) і ў развіцьцё загаду ВСНГ СССР за 6-X-27 г. № 21 (ТНГ за 9-IX-27 г. № 231), Вышэйшы Савет Народнае Гаспадаркі БССР пастанаўляе:

1. Пуркі, якія ўжываюцца для вызначэньня натуры зярна і насеньня пры нарыхтаваньні хлеба і гандлёвых угодак, павінны падлягаць абавязковай перыядычнай праверцы і кляйменьню ў Беларускай Паверачнай Палаце Мер і Вагаў (г. Менск), а для Віцебскай, Полацкай і Аршанскай акруг—у Віцебскім аддзяленьні Палаты.

2. Паверка і кляйменьне пурак утвараецца паводле правілаў вызначэньня натуры зярна і інструкцыі па вытварэньні пурак, якія выдаюцца Галоўнай Палатай Мер і Вагаў пры ВСНГ СССР.

3 Аплата за кляйменьне спаганяецца на падставе пастановы ВСНГ СССР і НКФ СССР за 6-X-27 г. у наступным разьмеры: за паверку мэтрычнай дваццацілітравай пуркі—15 р., мэтрычнай літравай пуркі—4 р., ¼ літравай пуркі—3 р.

4. Абавязковая паверка вытвараецца з 15-га лістапада 1927 г. да 1 студзеня 1928 г

5. Асобы, вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы, прыцягваюцца да адказнасьці ў судовым або адміністрацыйным парадку, згодна 18 арт. Палажэньня аб мерах і вагах.

Старшыня ВСНГ БССР КАРП.
Нач. адм. гасп. кіраўніцтва ЛУЧЫШЫН.

Галоўлітбел № 2468.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ.
ВЫШЛІ З ДРУКУ
НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ:

ТАРАС ГУШЧА (Я. Колас).—У палескай глушы. Аповесьць. Выд. II-е. Стар. 210. Цана . . . . . 1 р. 50 к.
ЯКУБ КОЛАС.—Новая зямля. Поэма. Выд. II-е. Стар. 318. Цана . 2 р. — к.
А. ЧАРВЯКОЎ.—Беларусь да X гадавіны Кастрычніка, Стар. 61. Цана . . . . . — 40 к.
І. БЭН.—Нажыўся. П'еса ў 2-х дзеях, 3-х абразкох. Стар. 26. Цана . . . . . — 30 к.
А. НЯВЕРАЎ.—Як у нас вайна была. Зборнік дзіцячых апавяданьняў з малюнкамі. Стар. 22. Цана. . . . — 40 к.
ТАЙШЫН.—Палітграмата. Падручнік для вясковых рухомых школ і самаадукацыі. Стар. 416. Цана . . . . 1 р. 50 к.

НА РАСЕЙСКАЙ МОВЕ:

А. ЧАРВЯКОЎ.—Белоруссия к X годовщине Октября, Стр. 64. Цана . . . . . — 40 к.

НА ЯЎРЭЙСКАЙ МОВЕ:

КНОРЫН.—1917 год на Беларусі і Заходняй Еўропе. Стар. 96. Цана. — 70 к.

1—2

Гр-ка г. Лепінскага с.-с., Слуцкага раёну, Бабруйскай акругі, Яніна-Стэфанія Альфонсава МАРОЗАВА абвяшчае аб скасаваньні шлюбу з гр-нам Васілём Грыгоравым МАРОЗАВЫМ, які знаходзіцца невядома дзе.

— Жлоб